WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 ЛІСТАПАДА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 211
(26569)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!

Сардэчна віншую вас са святам — Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Па шматгадовай традыцыі мы адзначаем гэту яркую гістарычную дату. Нягледзячы на розныя сучасныя ацэнкі, застаецца неаспрэчным, што Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя адкрыла новую эпоху ў развіцці чалавецтва, увасобіла ў жыццё такія асноватворныя прынцыпы, як права нацый на самавызначэнне, павага да людзей працы, сацыяльная справядлівасць. Яна стварыла ўмовы для нацыянальнага адраджэння шмат якіх народаў, утварэння сусветнай дзяржавы — Савецкага Саюза.

Сацыяльна-эканамічныя і культурныя дасягненні СССР былі сапраўды беспрэцэдэнтнымі. Яны ўпісаныя ў гістарычны летапіс баявых перамог і працоўных подзвігаў. Беларусы паважліва ставяцца да гэтай лёсавызначальнай даты, паколькі дзякуючы падзеям 1917 года ўпершыню набылі сваю дзяржаўнасць. Беручы ў спадчыну ўсё лепшае з мінулага, беларускі народ у складаных умовах мэтанакіравана ідзе па шляху ўмацавання маладой суверэннай дзяржавы, з аптымізмам глядзіць у будучыню.

Шчыра жадаю вам, дарагія суграмадзяне, здароўя, шчасця і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Няхай вам заўсёды спадарожнічае поспех у працы на карысць любімай Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ І УКРАІНА ЗНЯЛІ ЎСЕ ПРАБЛЕМНЫЯ ПЫТАННІ Ў АДНОСІНАХ»

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па выніках сустрэчы з кіраўніком украінскай дзяржавы Віктарам Юшчанкам.

«Мы тры гады карпатліва, пад крытыкай і ўдарамі асобных людзей збіралі гэтыя пытанні, каб аднойчы іх вырашыць. Сёння мы рассеклі гэты вузел, знялі ўсе пытанні, якія існавалі ў нашых адносінах», — сказаў беларускі лідар. Ён дадаў, што сёння можна гаварыць аб завяршэнні фарміравання дагаворна-прававой базы паміж дзяржавамі, якая налічвае 70 дакументаў па ўзаемадзеянні на розных узроўнях.

Фота БЕЛТА.

«Думаю, мы можам сказаць, што ўсё, што патрэбна было ад кіраўнікоў дзяржаў, мы зрабілі. Цяпер у нас няма ніякіх бар'ераў, перашкод у адносінах. Мы іх знялі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Цяпер працаваць трэба ўрадам, суб'ектам гаспадарання дзвюх краін, каб поўнасцю рэалізаваць існуючы ў дзвюх краін патэнцыял. «Калі мы будзем разваротлівыя, то і тавараабарот у нас будзе $10 млрд», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў кіраўніцтву Украіны за каласальную падтрымку Беларусі ў выбудоўванні адносінаў з іншымі дзяржавамі, перш за ўсё з Захадам і ЗША. «Гэта адкрытая, сумленная пазіцыя. Яна дарагога каштуе», — лічыць ён. «Віктар Юшчанка вывеў нашы адносіны на ўзровень ЕС і Еўропы, за што я ўдзячны кіраўніцтву Украіны», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Адносіны Беларусі і Украіны напружваюць некаторых кіраўнікоў у іншых краінах. Я разумею іх рэакцыю. Гэты альянс дае магчымасць жыць людзям нашых краін лепш, і мы будзем апірацца адзін на аднаго», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, Беларусь і Украіна — стратэгічныя тэрыторыі. «Еўрапейскі саюз ёсць і будзе і без Беларусі і Украіны. Але Еўропы без Беларусі і Украіны быць не можа, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Не толькі мы імкнёмся мець доступ на высокатэхналагічныя рынкі, але і еўрапейцы павінны цаніць нас як важны рэгіён».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў значнае развіццё за тры апошнія гады адносінаў у галіне энергетыкі, транзіту. Па шэрагу пазіцый кантакты з украінскім бокам для Беларусі яшчэ больш выгадныя, чым з Расіяй.

У сваю чаргу Віктар Юшчанка заявіў, што Еўропе выгадна, калі паміж Беларуссю і Украінай існуюць адкрытыя і дынамічныя адносіны. Гэты рэгіён, паводле яго слоў, можа рынесці вялікую карысць для еўрапейскай прасторы.

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі выклікі сучаснасці планетарнага маштабу і спосабы адказу на іх. «Мы прыйшлі да меркавання, што Беларусь і Украіна дастойна выглядаюць на гэтым фоне. Мы найперш забяспечваем інтарэсы нашых народаў, а яны заслужылі, каб жыць дастойна. Мы не збіраемся рабіць гэта за кошт іншых дзяржаў, народы могуць зрабіць гэта самі, мы толькі павінны стварыць ім умовы», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка і Віктар Юшчанка ў Кіеве маюць намер падвесці вынік напрацаванаму за тры гады. Аб гэтым заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы на сустрэчы ў вузкім складзе са сваім украінскім калегам.

«Па меры таго як нашы дзяржавы ўмацоўваліся, станавіліся сапраўды незалежнымі, суверэннымі, з'яўляліся пытанні, і мы павінны былі займацца іх упарадкаваннем, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы дамовіліся, што сустрэнемся і падагульнім тое, што за тры гады змаглі напрацаваць. Так ці інакш, у нас будуць з'яўляцца новыя пытанні, якія трэба будзе вырашаць».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што прайшло ўжо даволі шмат часу з яго афіцыйнага візіту ва Украіну, але гэта не значыць, што прэзідэнты ўвесь гэты перыяд нічога не рабілі. У апошнія тры гады ішла інтэнсіўная работа па ўпарадкаванню існуючых ва ўзаемаадносінах дзвюх краін пытанняў. «Мы неаднаразова з вамі сустракаліся, прайшлі вялікі шлях. У асабістых адносінах мы з вамі ніколі не разыходзіліся, не сварыліся, у нас ніколі не было канфліктаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Віктара Юшчанкі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы запэўніў украінскі бок, што ў іх не будзе ніякіх праблем з беларусамі. «Любыя пытанні будуць вырашацца на карысць абодвух народаў. Бо нашы інтарэсы супадаюць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што падтрымка двухбаковых адносінаў будзе забяспечвацца і на міжнароднай арэне. «Калі каму-небудзь не вельмі спадабаецца, што мы з вамі сустракаемся, то гэта яго праблема. Мы не сябруем супраць некага. Мы толькі хочам, каб нашы людзі жылі дружна і ў дастатку», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што напярэдадні паглядзеў фільм «Тарас Бульба», які нагадаў аб тым, што трэба свята ўшаноўваць продкаў і зробленае імі для народаў. Ён таксама дадаў, што ў яго з Кіевам звязана шмат успамінаў.

«Праблем з беларуска-ўкраінскай граніцай сёння няма. Іх і раней не было», — сказаў кіраўнік дзяржавы, маючы на ўвазе заключэнне дагавора аб граніцы.

«Мы з Віктарам Юшчанкам дастаткова доўга вырашалі гэтыя пытанні, пачынаючы ад граніцы і завяршаючы сумеснымі праектамі «Усходняга партнёрства», — адзначыў Прэзідэнт. «Усё тут будзе, як трэба», — дадаў беларускі лідар.

Беларусь і Украіна падпісалі мемарандум аб узаемадзеянні па рэалізацыі ўзаемавыгадных праектаў у рамках ініцыятывы «Усходняе партнёрства».

Падпісанне дакументаў адбылося ў Кіеве ў прысутнасці прэзідэнтаў дзвюх краін пасля завяршэння іх перагавораў. Кіраўнікі дзяржаў таксама прынялі сумеснае камюніке.

Акрамя таго, было заключана міжурадавае пагадненне аб выязным кірмашовым гандлі ў прыгранічных рэгіёнах Беларусі і Украіны таварамі нацыянальнай вытворчасці. Падпісаны таксама пратакол аб абмене ратыфікацыйнымі граматамі Консульскай канвенцыі паміж Беларуссю і Украінай.

Бакі таксама заключылі пагадненні па рэгіянальным узаемадзеянні, у прыватнасці аб супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і культурна-адукацыйнай сферах паміж Мінскай і Львоўскай абласцямі, гарадамі Гомель і Чарнігаў.

У час афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва Украіну будуць падпісаны базавыя дакументы, якія вызначаюць адносіны дзвюх краін. Аб гэтым паведаміў Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка.

«За 12 гадоў гэта ваш першы афіцыйны візіт ва Украіну, — сказаў Віктар Юшчанка, звяртаючыся да Аляксандра Лукашэнкі. — Ён будзе вельмі змястоўны».

«Я поўны надзей, што тыя пытанні, якія перад намі стаяць (а яны няпростыя — гэта супрацоўніцтва пагранічнае, энергетычнае, ва «Усходнім партнёрстве», гуманітарнай сферы), будуць вырашаны», — падкрэсліў Прэзідэнт Украіны.

Віктар Юшчанка назваў адносіны паміж Беларуссю і Украінай адносінамі стратэгічных партнёраў. Ідзе актыўнае ўзаемадзеянне ў палітычным жыцці, даволі высокі ўзровень супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы. «Усё гэта сведчыць аб наяўнасці асаблівых адносінаў паміж краінамі. Нашы адносіны з беларускім народам знакавыя, яны толькі мацнеюць з цягам часу. Гэта даверныя, суседскія адносіны».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка аддалі даніну памяці ахвярам Галадамору. Учора кіраўнікі дзвюх дзяржаў наведалі помнік ахвярам Галадамору і ўсклалі вянкі да Магілы Невядомага салдата. «У тым, што мы сюды прыехалі з Віктарам Юшчанкам, няма ніякай палітыкі. Тут загінулі мільёны людзей. Мы прыехалі, каб аддаць даніну памяці і павагі загінулым», — сказаў Аляксандр Лукашэнка журналістам. На пытанне ўкраінскага журналіста, ці збіраецца Беларусь прызнаваць Галадамор, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Не, мы яшчэ не збіраемся, мы да гэтай праблемы так, як вы, яшчэ не падыходзілі».

Калі раніцай дзеці Кундзікавых выходзяць у школу, з абавязковым заходам у дзіцячы садок, то суседзям падаецца — ідзе добра арганізаваны клас! У самым вялікім сямейным дзіцячым доме Беларусі цяпер жывуць 18 дзяцей. А ўсяго ў Маргарыты Уладзіміраўны Кундзікавай — 32(!) дзіцяці, прычым старэйшыя ўжо ажаніліся і нарадзілі ёй унукаў.

СЯМ'Я КУНДЗІКАВЫХ — 32(!) ДЗІЦЯЦІ

ТРОЕ ПРЫГОЖЫХ ДЗЕТАК

Міня — хлопчык з доўгімі русымі валасамі і блакітнымі вачыма як у аляняці з мультфільма. Ён трапіў у дом Кундзікавых праз два тыдні ад нараджэння. Яго нарадзіла няпоўнагадовая маці, якая доўга перацягвалася, таму са здароўем у малога было шмат праблем. Цяжка паверыць, што гэты гарэзлівы рэкламны прыгажун пайшоў толькі ў два гады. Маргарыта Уладзіміраўна і яе старэйшыя дзеці няньчыліся, рабілі масажы, займаліся, а цяпер не могуць налюбавацца на свайго любімца.

Каця ў 4 гады — рагатушка і шчабятуха. Абаяльнае стварэнне з задорнымі хвосцікамі расказвае ўсё, што бачыць, спявае і так прыгожа ўсміхаецца, што на сэрцы цяплее. Відаць, будучая артыстка! Яна з няўдалай сям'і: маці трагічна загінула, а бацька недзе ёсць толькі тэарэтычна. Дзяўчынка, якой не споўнілася і года, жыла спачатку ў бальніцы, потым у доме дзіцяці. Адтуль яе забрала Маргарыта Уладзіміраўна.

Фотаздымкі **Асі** ў маленстве Кундзікава паказвае ў сваім інтэрнэт-блогу для параўнання — якім, прабачце, бярвенцам ляжала кінутая ў бальніцы 6-месячная малая.

— Яна не ўмела ўсміхацца і, напэўна, увогуле не ведала, што такое бацькоўскія рукі, — каментуе Маргарыта Уладзіміраўна. — Як у Ахматавай: «Калі б вы ведалі, з якога смецця атрымліваюцца вершы». Калі б вы ведалі, з чаго атрымліваюцца добрыя дзеці! Часам з нейкага незразумелага камочка. Галоўнае — любіць дзяцей, астатняе дадасца.

СТАР. 2

Уладзімір МАКЕЙ:

«Беларусь чакае ад Савета ЕС поўнай адмены санкцый»

Беларусь чакае ад маючага адбыцца ў гэтым месяцы пасяджэння Савета Еўрапейскага саюза рашэння аб поўнай адмене санкцый у адносінах да нашай краіны. Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей на адкрыцці XII Мінскага форуму «Беларусь і Усходняе партнёрства: перспектывы развіцця ў сферах палітыкі, эканомікі і грамадства» 4 лістапада.

«Нельга адначасова працягваць адну руку для палітычнага дыялога, а другой чыніць перашкоды ў развіцці гандлёва-эканамічных сувязяў і кантактаў паміж людзьмі», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Кіраўнік Адміністрацыі адзначыў, што жорсткі гандлёвы рэжым, а таксама факт таго, што грамадзяне Беларусі адзіныя ва ўсёй Усходняй Еўропе павінны плаціць за шэнгенскія візы 60 еўра, з'яўляецца фактарам, які фарміруе негатыўнае стаўленне ў беларускім грамадстве.

«Еўрасаюз заўсёды выступаў за развіццё кантактаў паміж грамадзянскімі супольнасцямі Беларусі і еўрапейскіх краін. Але пры гэтым, пасля ўвядзення жорсткага візавага рэжыму для паездак у суседнія краіны, колькасць беларускіх грамадзян, якія наведваюць Еўрасаюз, зменшылася на 20 працэнтаў», — сказаў Уладзімір Макей.

«Ініцыятыва «Усходняе партнёрства» мае для нас несумненны інтарэс, і мы гатовы ўдзельнічаць у ёй без усялякіх агаворак як у двухбаковым, так і шматбаковым фарматах», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Пры гэтым кіраўнік прэзідэнцкай Адміністрацыі растлумачыў, што ўдзел Беларусі ва «Усходнім партнёрстве» ні ў якай меры не азначае змены знешнепалітычнага курсу, а толькі сведчыць аб імкненні збалансаваць сваю знешнюю палітыку, накіраваную на добрасуседскія адносіны з еўрапейскімі дзяржавамі. «Шматвектарная палітыка Беларусі не накіравана і не можа быць накіравана супраць якой-небудзь краіны», — сказаў Уладзімір Макей.

Беларусь разлічвае на актыўны ўдзел Германіі ў прыватызацыйным працэсе і на пашырэнне інвестыцый у беларускую эканоміку.

Кіраўнік прэзідэнцкай Адміністрацыі таксама выказаў надзею на экспертна-кансультацыйную падтрымку германскага боку ў фарміраванні ў Беларусі спрыяльнага дзелавога клімату.

«Германія традыцыйна з'яўляецца адным з нашых ключавых партнёраў, — заявіў Уладзімір Макей. — Пры гэтым хачу асабліва адзначыць пазітыўную ролю Усходняга камітэта нямецкай эканомікі і асабіста яго старшыні Клаўса Мангольда як у развіцці дзелавога супрацоўніцтва нашымі краінамі, так і ў давядзенні аб'ектыўнай і ўсебаковай інфармацыі аб Беларусі да эканамічнай і палітычнай эліты Германіі». Кіраўнік Адміністрацыі канстатаваў, што палітра беларуска-германскіх адносінаў ахоплівае самыя розныя сферы: ад прамысловасці да культуры.

На думку Уладзіміра Макея, па-сапраўднаму прагрэсіўнае будучае еўрапейскай інтэграцыі магчыма толькі ў выпадку «падзення яшчэ адной берлінскай сцяны, якая ў еўрапейскім мысленні ўяўляе сабой нейкі раздзяляльны бар'ер паміж Захадам і Усходам».

Характарызуючы поспехі ў паступовым дыялогу Беларусі з еўрапейскімі дзяржавамі і інтэграцыйнымі структурамі, Уладзімір Макей сказаў: «Сёння адбываецца тое, што павінна было адбыцца намнога раней. Рудыменты канфрантацыйнага падыходу нарэшце саступаюць месца канструктыўнасці і прагматызму». «За год, які прайшоў з мінулага Мінскага форуму, мы паспелі зрабіць больш, чым за ўсе гады палітыкі ізаляцыі Беларусі з боку Захаду», — дадаў ён.

Кіраўнік Адміністрацыі працытаваў словы літоўскага прэзідэнта Далі Грыбаўскайтэ аб тым, што канструктыўны дыялог з Беларуссю — гэта патрабаванне часу, паколькі вопыт мінулых гадоў сведчыць аб поўным правале палітыкі ізаляцыянізму.

БЕЛТА.

ПАЧАЛАСЯ ВЫПЛАТА ПЕНСІЙ ЗА 7 і 8 ЛІСТАПАДА

У Беларусі пенсію за 7 і 8 лістапада гэтага года выплацяць на некалькі дзён раней, паведамілі ў РУП «Белпошта».

У сувязі са святкаваннем Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі графік выплаты пенсій за суботу, 7 лістапада, і нядзелю, 8 лістапада, падкарэктаваны. Дарэчы, у гэтыя дні будуць функцыянаваць толькі дзяжурныя аддзяленні паштовай сувязі. Датэрміновая выплата пенсій за 7 лістапада ў Мінску і Брэсцкай вобласці пачалася ўжо 4 лістапада, а ў Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях — 5 лістапада. Выплата пенсій за 8 лістапада ў Мінску, Мінскай і Брэсцкай абласцях праводзіцца з 5 лістапада, у Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях яна будзе ажыццёўлена 6 лістапада.

БЕЛТА.

НЕ СПАЗНІЦЕСЯ З ПЛАЦЯЖАМІ!

16 лістапада — апошні дзень унясення плацяжоў за зямлю і падатку на нерухомасць.

Гэта датычыцца тых, хто мае ва ўласнасці жылыя дамы, садовыя домікі, дачу, кватэры і пакоі, у тым ліку будаўніцтва якіх яшчэ не завершанае, а таксама тых, каму выдзеленыя ва ўладанне, карыстанне, уласнасць, арэнду зямельныя ўчасткі. Унесці плацяжы можна ў банку, на пошце або праз плацежна-даведачныя тэрміналы. Несвоечасова заплачаныя ў бюджэт падаткі спаганяюцца з налічэннем пені за кожны каляндарны дзень пратэрміноўкі. Спаганяецца таксама штраф у памеры 15 працэнтаў ад няўнесенай сумы (але не менш як адна базавая велічыня).

Наталля ЗАЯЦ, «Мінск—Навіны».

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 08 декабря 2009 года

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом принадлежащих Белорусскому республиканскому фонду «Взаимопонимание и примирение» (продавец) зданий, сооружений и иного имущества, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Якуба Коласа, 39а. В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование и характеристики продаваемого имущества	Литер	Инв. номер
1.	Административное здание общей площадью 790 кв. м	А 2/к	946
2.	Гараж (семь гаражных боксов) общей площадью 157 кв. м	Б 1/к	948, 949, 950, 951, 952, 953, 954
3.	КПП общей площадью 25 кв. м	В 1/к	955
4.	Кондиционер Airweli SX 28F		62
5.	Кондиционер Firweli ML 13		63
6.	УАТС Panasonic KX-TDA100RU		942-2
7.	Система видеонаблюдений		943
8.	Ограждение (ворота, плиты)		944
9.	Кондиционер настенный LGS07LHP		1124
10.	Кондиционер настенный LGS07LHP		1125
11.	Шлагбаум Upper 4.5		1126
12.	Система пожарной сигнализации и оповещения		1127

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке площадью 0,2805 га, кадастровый номер 500000000008002130, назначение – эксплуатация и обслуживание административного здания.

Начальная цена лота – 7 170 399 000 белорусских рублей без учета НДС.

Условие аукциона – сохранение за продавцом права безвозмездного пользования имуществом, входящим в состав лота, в течение 90 календарных дней с даты проведения аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 200 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в следующем порядке: 50 (пятьдесят) процентов от цены продажи, определенной в результате аукциона, с учетом внесенного задатка, перечисляются победителем торгов продавцу по 22.12.2009 включительно; оставшаяся часть – по 29.01.2010 включительно.

Аукцион состоится **08 декабря 2009 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 04.11.2009 по 04.12.2009 в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (г. Минск, ул. К. Маркса, 39);
(017) 292 57 85, (029) 270 43 61 – фонд «Взаимопонимание и примирение» (г. Минск, ул. Я. Коласа, 39а).

Сайт в интернете: www.mgcn.by

Ну і ну!

«МЯНЯЮ МАРЛЕВЫЯ ПАВЯЗКІ НА BMW!»

СІТУАЦЫЯ, як у тым анекдоце: Паведамленне на форуме: «Мяняю 10 марлевых павязак і пачатую аксалінавую мазь на BMW 5 серыі, не старэйшы за 2000 год». Праз 10 хвілін на тым жа форуме: «Прашу больш не звяртацца. Ужо памяняў...»

Як расказала ў гутарцы з журналістам «Звязды» **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна СУША**, у іх арганізацыю звярнулася некалькі чалавек, якіх цікавіла магчымасць вяртання ў аптэку медыцынскіх масак.

— Нам давялося патлумачыць ім, што вырабы медыцынскага прызначэння належнай якасці, як і лекавыя сродкі, уключаны ў пералік тавараў, якія абмену і вяртанню не падлягаюць, — расказала Ганна Суша. — І ўвогуле гэта сітуацыя з ажыятажам у аптэках вельмі нагадвае нам ажыятаж, які назіраўся ў студзені гэтага года, калі пасля рэзкага скачка курсу долара беларусы кінуліся ў крамы і літаральна за лічаныя дні «размялі» ўсю бытавую тэхніку, а затым цікавіліся ў нас, ці можна вярнуць у краму непатрэбны ім халадзільнік ці тэлевізар. Мы не пыталіся, колькі ж масак набылі гэтыя людзі, але калі за адзін дзень у краіне прадавалася па сто тысяч масак, можна меркаваць, што нашы людзі «запасаліся» грунтоўна.

Застаецца толькі здагадвацца, што падштурхнула людзей пазбавіцца ад сваёй пакупкі. Магчыма, паведамленне аб тым, што маска не дае стопрацэнтнай аховы ад віруса? Дык чаму б не прапанаваць залішнія маскі суседзям, сваякам ці калегам па працы?

Надзея НІКАЛАЕВА.

АУКЦИОН

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЗЕНИТ – БЕЛОМО» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующих зданий (цены снижены на 50 %): **Лот № 1:** здание специализированное розничной торговли (пристройка к дому), об. пл. 1576,5 кв.м, *г. Вилейка, ул. Чапаева, 60.* **Начальная цена с НДС – 379 339 416 бел. руб. Задаток – 35 000 000 бел. руб.** Площадь земельного участка – 0,1007 га. **Лот № 2:** здания специализированные складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ – здание склада ЛВЖ, об. пл. 684,9 кв.м, здание кислотного склада, об. пл. 196,5 кв.м, *г. Вилейка, ул. Красина.* **Начальная цена с НДС – 846 143 819 бел. руб. Задаток – 50 000 000 бел. руб.** Площадь земельного участка – 0,4619 га, имеется ж/д ветка; **Лот № 3:** здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования (производственный корпус № 7 с АБК), об. пл. 19605,9 кв.м, *г. Вилейка, ул. Чапаева, 26.* **Начальная цена с НДС – 5 521 767 668 бел. руб. Задаток – 100 000 000 бел. руб.** Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.10.2009 г. Аукцион состоится **13.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

АЖЫЯТАЖ ВАКОЛ ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ НА ГРЫП І ВРВІ СТВОРАНЫ ШТУЧНА

Такую думку выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора ў Кіеве, адказваючы на пытанні журналістаў.

«Я пацікавіўся, што адбывалася ў краіне ў гэты перыяд у 2008 годзе. Тады ад пнеўманіі памёр 21 чалавек, у гэтым годзе — 19. Усе былі абследаваны, і толькі ў шасці выявіліся падазрэнні на «свіны грып», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ідзе пастаянны маніторынг сітуацыі і за апошнія суткі адзначаецца сур'ёзны спад захваральнасці на ВРВІ. Гэтаму таксама садзейнічала ўстанаўленне марознага надвор'я. «Не трэба ўзнімаць гвалт. Не трэба ствараць штучна ажыятаж», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што немалую ролю ў раздуванні ажыятажу вакол гэтай сітуацыі стварылі і фармацэўтычныя кампаніі. «Няўжо вы не разумееце, што адбываецца? Гэта небяспечная і карумпаваная сфера, — сказаў ён. — Я ведаю, што адбываецца ў гэтым суперкарумпаваным асяроддзі».

«Гэта не чума і не халера. Гэта вылечнае захворванне, — адзначыў Прэзідэнт. — Праблема дзесьці і ў саміх людзях. Мы настойваем, каб людзі не займаліся самалячэннем. Не трэба ствараць ажыятаж, але калі захварэў — звярніся да спецыялістаў, якія ўсіх вылечаць». Кіраўнік дзяржавы падзякаваў медыкам за іх работу ў такіх умовах. «Медыкі — гэта сапраўды героі, якім давялося змагацца не толькі з захворваннем, але і з тым ажыятажам, які вакол усяго гэтага стварылі», — сказаў ён.

Што ж датычыцца прыняцця сумесных мераў Беларуссю і Украінай па барацьбе з захворваннем, то Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў гэтым няма неабходнасці. Кожная краіна ў стане справіцца з гэтым самастойна. «Не трэба пужаць людзей і абвастраць абстаноўку. Мы і так перагрузілі медыкаў. Няма ніякай неабходнасці ў нейкай сумеснай барацьбе супраць сезоннага захворвання на вірус», — падкрэсліў ён.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

БЕЗ ПАНІКІ

Парламенцкі дзённік

Падстаў для абвяшчэння эпідэміі грыпу ў Беларусі пакуль няма

Новых выпадкаў захворвання на пнеўманію штодня становіцца ўсё менш, — запэўніў, выступаючы ў парламенце, **міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО**. Пры гэтым ён не стаў адмаўляць, што наяўны ўзровень захваральнасці высокі. Аднак смяротнасць ад пнеўманіі сёлета значна меншая, чым летась. Міністр нагадаў, што прынятае рашэнне аб шпіталізацыі ўсіх хворых з такім дыягназам. Ён таксама запэўніў, што ў лячэбных установах ёсць увесь неабходны асартымент лекавых сродкаў і тэхнікі для лячэння хворых на пнеўманію.

У гутарцы з журналістамі міністр назваў рашэнне аб падаўжэнні школьных канікулаў правільным і своечасовым. Ён таксама лічыць верагодным аднаўленне навучальнага працэсу з наступнага панядзелка — уводзіць каранцін пакуль не плануецца. Пры необходнасці гэта можна зрабіць кропкава — у канкрэтнай школе ці ў раёне. Міністр зрабіў акцэнт на тым, што падстаў для абвяшчэння эпідэміі грыпу ў Беларусі пакуль няма. Вакцына ж ад A/H1N1 паступіць у нашу краіну, як толькі будзе выраблена ў Расіі. На выплатнай ці бязвыплатнай аснове атрымае яе дзяржава — таксама будзе вырашана пасля яе стварэння. Калі вакцына паступіць, будзе прымацца рашэнне аб тым, «для якіх катэгорый грамадзян яна патрэбная».

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

Для вырашэння далікатнага палітычнага пытання беларускія парламентарыі вывучаць сітуацыю ў Грузіі, Абхазіі і Паўднёвай Асеціі асабіста

«Да гэтага пытання нельга падыходзіць аднабока, каб прыняць канчатковае рашэнне, трэба мець аб'ектыўную аснову і вывучыць сітуацыю не толькі ў Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, але і ў Грузіі», — паведаміў журналістам **Віктар ГУМІНСКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы**. Восем дэпутатаў і чатыры сенатары будуць вывучаць сітуацыю на Паўднёвым Каўказе з 17 па 20 лістапада: шасцёра наведаюць Грузію, па трое — Абхазію і Паўднёвую Асецію. Тым часам група дэпутатаў будзе працаваць на сесіі Парламенцкага Схода Беларусі і Расіі ў Маскве.

Працаваць, працаваць і яшчэ раз працаваць

Праект Кодэкса аб адукацыі атрымаў у першым чытанні 96 дэпутацкіх «за» і толькі тры «супраць»

Дакумент, які, у выпадку прыняцця беларускімі заканадаўцамі, рызыкуе стаць першым такога кшталту ў свеце, на кожным публічным абмеркаванні выклікае вельмі шмат пытанняў, заўваг і прапаноў. І чуора пры разглядзе ў Авальнай зале таксама выклікаў, хоць напярэдадні актыўна абмяркоўваўся на пашыраным пасяджэнні галаўной камісіі. Можа таму, што адказаў на многія пытанні пакуль няма?.. Чыноўнікі заўжды кажуць нешта накшталт «паглядзім». А дэпутаты не стамляюцца паўтараць пра павышэнне заробкаў педагогам, вяртанне профільнага навучання ў сярэдняй школе, бясплатны праезд для школьнікаў... І маюць рацыю.

— Ва ўстановы адукацыі — дашкольнай і агульнай сярэдняй — людзей штодня дастаўляюць 586 аўтобусаў. Вядома ж, гэта для сельскіх навучэнцаў — у сувязі з тым, што мы вымушаныя аптымізаваць сістэму адукацыі (гэта датычыцца малакамплектных школ), дастаўка бясплатная. У гарадскім транспарце пытанне па льготах у аплаце за дастаўку навучэнцаў да месцаў навучання і выхавання прапрацоўваецца. Пакуль яно заканадаўча не ўрэгуляванае. Я думаю, што мы папрацуем над гэтай нормай, аднак сёння сказаць, што ў гарадской мясцовасці будзе бясплатны праезд для навучэнцаў, я не гатовы, — адзначыў **намеснік міністра Казімір ФАРЫНО**, адказваючы на пытанні народных абраннікаў.

У адказ на скаргі дэпутатаў (агучаныя ад імя выбаршчыкаў, зразумела) па скасаванні профільных класаў і «змушанае» рэпетытарства Казімір Фарыно выказаўся так:

— Профільная адукацыя ў тым выглядзе, як яна рэалізоўвалася, у школьную практыку не вернецца. Мы даём дзецям агульную сярэднюю адукацыю. Асноўны, базавы блок прадметаў вывучаецца ўсімі навучэнцамі аднолькава, таму роўныя ўмовы ў атрыманні якаснай адукацыі створаныя ва ўсіх тыпах устаноў адукацыі. Мы штомесяц праводзім маніторынг якасці адукацыі, факультатыўны складальнік вырашае пытанні прафарыентацыйнай дзейнасці — выбару сваёй прафесійнай будучыні. Што такое рэпетытар? Хатні настаўнік. І сёння, калі бацькі маюць магчымасць мець хатняга настаўніка, хіба гэта дрэнна? Гэта заўсёды было, ёсць і будзе. Сёння сям'я адыходзіць ад адказнасці за атрыманне якаснай адукацыі — нехта павінен яе даць, навучыць, выхаваць — рэпетытары, гувернантки і гэтак далей... У сям'і павінны вырашацца ўсе пытанні якаснай адукацыі дзяцей.

Аднак далёка не ўсе бацькі маюць магчымасць аплачваць паслугі рэпетытараў, і для такіх сем'яў профільныя класы, дзе больш глыбока вывучаецца пэўны блок прадметаў, на які і «нацэлілася» дзіця, былі б выйсцем... І потым, што дрэннага ў ранейшай вузкай спецыялізацыі — чаму б малым Эйнштэйнам яшчэ ў падлеткавым узросце не сканцэнтравацца на фізіцы, «эканоміўшы» час на вывучэнні літаратуры ў «непад'ёмных» маштабах? Аднак педагогам з іх званіцы, відаць, бачна лепш...

Пра многія болевыя кропкі згадаў, выступаючы ў Авальнай зале, **старшыня пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір ЗДАНОВІЧ**:

— Праект Кодэкса можна параўнаць з трывалым каркасам жылога дома, які будуецца, аднак, паводле нашага меркавання, жыць у гэтым доме пакуль вельмі рана. Праект мае патрэбу ў істотнай дапрацоўцы і па структуры, і па змесце канкрэтных нормаў. Нам давядзецца распрацаваць шэраг артыкулаў, якія будуць вызначаць прыярытэтныя кірункі развіцця сістэмы адукацыі.

— У праекце абойдзеныя наяўныя агульныя і прыватныя праблемы, якія патрабуюць вырашэння. Сярод агульных — паніжэнне сацыяльнага статусу педагагічных супрацоўнікаў, рост узроўню беспрацоўя сярод выпускнікоў, якія маюць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю пры наяўнасці вакансій на рабочых спецыяльнасцях, нявызначанасць узаемаадносінаў з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі, **змяншэнне колькасці тых, хто навучаецца на беларускай мове**, адсутнасць выразна сфармуляваных патрабаванняў да выпускнікоў устаноў адукацыі.

— У дашкольнай адукацыі нас трывожыць праблема захавання здароўя дзяцей, якое можа пацярпець ад актыўнага ўкаранення заняткаў у форме ўрокаў, няхай і меншай працягласці, чым у школе; праблема заробкаў і адпачынкаў выхавальнікаў дашкольных устаноў. Нягледзячы на цэлы раздзел, прысвечаны дысцыплінарнай адказнасці навучэнцаў, праблема ўзаемаадносінаў «настаўнік — вучань» у праекце так і не вырашаная. Захоўваецца неадназначнае стаўленне грамадства да адмены профільнага навучання, і гэта найсур'ёзнейшая праблема. Неабходна спрасціць сістэму ацэньвання, таму што настаўнікі блытаюцца ў выстаўленні выніковых адзнак. І думаю, нават міністр адукацыі — матэматык — не змог бы з-за найскладанейшага алгарытму падліку выставіць адзнакі за чвэрць па фізкультуры. Дзесяцібальная сістэма, наогул кажучы, дала эфект — у нас зніклі ў школах непаспяваючыя, але толькі з-за таго, што адзін-два балы (пастарому гэта паўкала) сталі лічыцца станоўчай адзнакай. Ёсць пытанні з прыёмам дзяцей у гімназіі па пратэкцыі, з матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем школ, вучэбнымі кнігавыданнямі (дарэчы, у праекце аб гэтым няма згадвання), прыцягненнем вучняў і настаўнікаў да выканання абавязкаў, не прадугледжаных нарматыўна-прававымі актамі, нарастаючай колькасцю справаздач, добраахвотна-прымусовым зборам сродкаў ад бацькоў на патрэбы школ і масавым распаўсюджаннем рэпетытарства. Рэпетытары працуюць, у кодэксе ні слова пра іх няма. Неабходна ссоўваць навучанне з класаў і аўдыторый непасрэдна на вытворчасць: тэорыя — у класах, навучанне прафесіі — на вытворчасці, такім павінен быць прынцып. Вышэйшая адукацыя ў краіне стала масавай, і гэта наш гонар, але разам з тым — найсур'ёзнейшая праблема. Рост колькасці дыпламаваных спецыялістаў суправаджаецца агульным зніжэннем узроўню іх падрыхтоўкі. Цяпер у ВНУ паступае амаль кожны ахвотны, і як вынік — штогод з ВНУ па прычыне непаспяховасці адлічаецца каля 16 тыс. маладых людзей. Павелічэнне колькасці студэнтаў у беларускіх ВНУ значна апярэджвае рост колькасці штатнага персаналу — асабліва выкладчыкаў, якія маюць вучонае званне. Статыстычныя звесткі паказваюць — у пачатку тысячагоддзя на аднаго выкладчыка прыпадала каля 10 студэнтаў, цяпер — амаль 20. Гэта дазваляе зрабіць выснову аб павышэнні інтэнсіўнасці выкладчыцкай працы, якое вядзе да рамеснічтва і зніжэння яе якасці. У праекце суадносіны «выкладчык — студэнт» абмяжоўваюцца лічбамі 1:10, аднак, відаць, трэба заканадаўча абмежаваць і напаўняльнасць груп да 20 чалавек і ўвесці жорсткія нарматывы прыёму на завочную і платную формы навучання. Нам неабходна інвеставаць не ў колькасць, а ў якасць. Недапушчальна існаванне ВНУ, у якіх 90 працэнтаў студэнтаў навучаецца завочна, а таксама ВНУ, якія не маюць інтэрнатаў і пунктаў харчавання. У нас што, пасляваенная разруха?

— Цяпер ідзе тэндэнцыя да камерцыялізацыі работы ВНУ. Кошт навучання расце значна хутчэй за тэмпы інфляцыі, таму з вялікай нацяжкай можна назваць дзяржаўнымі тыя ВНУ, дзе дзве траціны студэнтаў залічаюцца на вучобу за грошы. Неабходна заканадаўча вырашыць пытанне аб скарачэнні тэрмінаў навучання за кошт аптымізацыі праграм, выразна вызначыць статус выпускнікоў магістратуры, увязаць іх колькасць з колькасцю месцаў у аспірантуры і вырашыць праблему выдачы дыпломаў замежным грамадзянам. Дагэтуль не ўкаранёныя адносіны матэрыяльнай адказнасці вышэйшых навучальных устаноў за якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, хоць замацаванне такіх нормаў магло б павысіць узровень навучальна-выхавацчай работы ВНУ.

Што б ні казалі пра неабходнасць дапрацовак і перапрацовак у Кодэксе, аднак абсалютная большасць дэпутатаў прапанаваны да разгляду ў аўтарскай рэдакцыі праект падтрымала: 96 дэпутатаў націснулі кнопку «за», трое — «супраць», трое — не галасавалі. На тое, каб скарэктаваць Кодэкс з уліка выказаных прапаноў (якія прызнаныя неканцэптуальнымі), ёсць роўна год — на разгляд дэпутатаў у другім чытанні праект плануецца вынесці ў наступную восеньскую сесію.

Ала МАЧАЛАВА.

СЯМ'Я КУНДЗІКАВЫХ — 32(!) ДЗІЦЯЦІ

Ася, Міня і Каця – малодшыя выхаванцы Кундзікавых.

АГІДНАСЦЬ САЦЫЯЛЬНАГА СІРОЦТВА

Два дзясяткі гадоў таму, калі ёй было 28, Кундзіка-ва ўзяла дзяцей. Яна па прафесіі — выхавальнік, і за сваё працоўнае жыццё прайшла шлях ад нянечкі да загадчыцы дзіцячага садка. Мужа Сяргея ведае з дзяцінства, у шчаслівай сям'і нарадзіліся трое дзяцей. Але аднойчы жыццё змянілася пасля, падаецца, цалкам будзённай падзеі: Маргарыта Уладзіміраўна з Клічава паехала ў абласны цэнтр на курсы, дзе трапіла на экскурсію ў дзіцячы дом.

— Гэта быў нейкі ступар, — узгадвае жанчына свае ўражанні. — Я сутыкалася з рознымі сем'ямі на працы, але з такой агіднасцю, як сацыяльнае сіроцтва, сутыкнулася ўпершыню. І супала, што на першым тэлемарафоне на карысць дзяцей-сірот расказалі пра новую форму выхавання — сямейны дзіцячы дом. І ўсё: я заявіла, што буду гадаваць дзяцей.

Трэба было ўзяць для адкрыцця такога дома 5 дзяцей, трое было сваіх, і Маргарыта Уладзіміраўна спачатку і не думала браць болей. Але прайшло колькі гадоў, і нехта з медыкаў выпадкова сказаў: «У нашым радзільным доме ёсць дзяўчынка, ад якой адмовіліся. Не хочаце паглядзець?»

Сямейны дзіцячы дом мае свой герб – з самаварам і фотаздымкамі ўсіх дзяцей.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Такое здараецца толькі ў серыялах, — усміхаецца яна. — Я заходжу ў раддом і сутыкаюся ў дзвярах з жанчынай. Мы міла паўсміхаліся адна адной, прабачаліся, і я пайшла глядзець дзіця. Надзі было 5 дзён, яна была неданошаная, маленькая, нібы вусень. Я яе, безумоўна, забрала. А мне кажуць: «А вы там Надзіну маці не сустрэлі? Яна толькі што падпісала паперы на адмову ад дзіцяці і выйшла». Так, я яе сустрэла, і больш ніколі не бачыла. А яна кінула ў раддоме яшчэ дваіх немаўлят.

ЖЫЛІ Ў КАЦЕЛЬНІ І КАРОЎНІКУ

Яна ніколі не блытае імёны сваіх дзяцей, нягледзячы на тое, што іх колькасць пераваліла за тры дзясяткі, і сярод іх чатыры Мішы ды тры Каці. Дарэчы, Надзя — адзіная з прыёмных дзяцей, каму Маргарыта Уладзіміраўна сама дала імя: Надзея — у гонар яе маці і светлай надзеі на шчаслівае жыццё ўсіх яе дзяцей, нават калі насуперак усяму.

Адны дзеці да яе жылі ў кацельні, іншыя — у кароўніку, ды елі прама з кармушкі. А, напрыклад, трое дзяцей з адной сям'і трапілі да Кундзікавых з Украіны. Там у пажары загінуў іх бацька, жыць на папялішчы было немагчыма. Тады маці, ураджэнка Клічаўскага раёна, прыехала сюды з дзецьмі і ўладкавалася на ферму даяркай. Аднак аднойчы, 31 снежня, пад Новы год жанчыну збіў аўтамабіль. Дзеці засталіся літаральна на вуліцы: іх нават у дзіцячы дом нельга было аформіць, таму што яны не мелі ніякіх дакументаў. Яны толькі плакалі — ім было страшна. Маргарыта Уладзіміраўна забрала іх і выхавала: старэйшая сястра ўжо пайшла замуж і стала маці дваіх дзяцей!

Дзеці растуць, і на паліцах з'яўляюцца вясельныя фотаздымкі. Даўно маюць свае дамы, мужоў і дзяцей, але ўсё адно едуць да сваёй маці.

— У іх, акрамя мяне, няма нікога, — проста тлумачыць Маргарыта Уладзіміраўна.

Яны проста не памятаюць сваіх бацькоў, якія іх пакінулі адных у тых ці іншых абставінах. І толькі адна з дзяўчатак аднойчы сказала маці: «Вось ты мяне ўзяла, а можа ў мяне недзе асабняк ёсць і бацька з «Мерседэсам». Ёй паказалі біялагічных бацькоў... — і ўсё.

ПРОЗВІШЧЫ РОЗНЫЯ, А СЯМ'Я АДНА

Сямейны дзіцячы дом Кундзікавых — гэта два вялікія дамы, аб'яднаныя пераходам. Тут усё вельмі проста і сціпла. Пакоі ўпрыгожваюць кветкі і калекцыі мяккіх цацак, на сценах — мастацкія працы дзяцей. Іх маляваліды вышывалі старэйшыя дзеці, таму што цяперашнія больш захапляюцца камп'ютарамі, чым рамёствамі.

У галоўным пакоі — два сучасныя камп'ютары. Адзін падарылі сябры — Клічаўская арганізацыя МНС, а на іншы самі дзеці збіралі грошы: здавалі ягады ды грыбы, складвалі стыпендыі і аддавалі заробкі ад летніх падпрацовак. Уклад бацькоў — кругласутачны хуткасны інтэрнэт.

У пакой радасна ўлятае невялікі чорны сабачка.

— Гэта мой Лунцік! — радасна крычыць Мінька.

— Нам падкінулі яго маленькім, — тлумачаць дзеці. — А Міня заўсёды трызніў пра Лунціка, героя мультфільма. Гэта быў нібыта яго выдуманы сябар. І калі сабачаня падкінулі, ён сказаў: «Да нас прыляцеў Лунцік!» Мы казалі, што сабака не вельмі падобны на самога Лунціка, але Міня аўтарытэтна заявіў, што гэта брат яго лепшага сябра.

Вы знешне ніколі не адрозніце дзяцей з сямейнага дзіцячага дома Кундзікавых ад іншых, якія жывуць у сваіх добрых сем'ях. Самыя маленькія — ну нібыта цацкі. Усе дзяўчаткі — неверагодныя модніцы. «Пакуль я жывая, мае дзеці будуць апранацца не горш за іншых», — адразае Маргарыта Уладзіміраўна. Гэтыя дзеці, хутчэй, адрозніваюцца ад іншых згуртаванасцю: яны ніколі не даюць крыўдзіць сваіх:

— Калі новае дзіця прыходзіць у сям'ю і нейкія праблемы ўзнікаюць, то часта чую: маўляў, што ж ты робіш, прозвішча ганьбіш? А прозвішчы ў іх усе розныя... Але сям'я — адна.

Што датычыцца дабрабыту, то такой вялікай сям'і грошай на ўсё-ўсё, вядома ж, не хапае.

— Але можна жыць па-рознаму: можа не хапаць на ікру, а можа — і на лусту хлеба, — вучыць мудрая Кундзікава. — Нам хапае на лусту хлеба з маслам. На ікру не хапае, але яна нам і не патрэбная. Мы і кабачковую паядзім. Нам бы на іншае...

Напрыклад, не хапае грошай, каб вазіць дзяцей на заняткі да мастакоў у Бабруйск для творчага развіцця. Ламаецца мэбля: дзеці скачуць па канапах бясконца. Заробкі выхавальнікаў і грашовая падтрымка на дзяцей ідзе, у асноўным, на харчы. Яны сям'ёй з'ядаюць штодня 7 кілаграмаў крупаў і 15 літраў супу, выпіваюць пакунак чаю, а на гатаванне страў патрабуецца поўная бутэлька алею. Таму што тазік гіганцкіх чабурэкаў — гэта толькі невялікі перакус для вялікай сям'і.

ПРАЦА ПА МАКАРАНКУ

Маргарыта Уладзіміраўна кажа, што трэба не толькі любіць дзяцей, але і ўмець іх выхоўваць. Яна называе сябе маці-фанатыкам і не проста цягне цяжкую лямку гадавання, а робіць гэта з энтузіязмам і на навукова-педагагічнай аснове. Яна — шчырая прыхільніца педагогаў Антона Макаранкі і Васіля Сухамлінскага.

— Я Макаранкам у юнацтве зачытвалася і зрабіла для сябе выснову: дзяцей трэба любіць строга, — лічыць Маргарыта Уладзіміраўна.

У сям'і Кундзікавых усё правільна. Старэйшыя клапоцяцца пра малодшых. Графік дзяжурстваў — на кухні. У кожнага на агародзе — свая градка. І гэта не проста нейкая працоўная павіннасць, а кавалак ад агульнай сямейнай адказнасці.

— Праца — аснова ўсяго, — вучыць маці. — Калі мы капаем бульбу, то самыя малодшыя ў сваіх цацачных вядзерцах хоць дзве бульбіны, але нясуць. Потым гордым працаўнікам дранікі рабілі з іх бульбін!

Падлеткі першыя мабільныя тэлефоны зарабілі самі сабе, і на самыя наймаднейшыя джынсы таксама.

— А таксама патрабавальнасць, — працягвае знаёміць з сістэмай выхавання «паводле Кундзікавай». — Я ніколі не мяняю свайго слова і не адмяняю пакаранне.

— Так, я спазнілася дадому — на наступныя выхадныя не пайду гуляць, — уздыхнула адна з дзяўчатак.

— А адна дзяўчынка пакараная тым, што ўжо тры гады не ходзіць на школьныя дыскатэкі, — погляд Маргарыты Уладзіміраўны цвёрды як сталь. — Была на гэта важкая прычына. Не, яна — залатое дзіця, але пойдзе толькі на выпускны баль. Проста амністыі за праступкі ў нас няма.

РАДАСЦЬ ПА СУХАМЛІНСКАМУ

Але нягледзячы на дысцыпліну і патрабавальнасць, з тваруў дзяцей не сыходзяць усмешкі. Такія шчаслівыя твары наўмысна не зробіш.

— Для нас вітамін радасці — гэта маці, — кажа адна з дзяўчатак.

— Атмасфера радасці — таму што дзеці дома, — працягвае Маргарыта Уладзіміраўна. — У нас тут не прытулак, а сапраўдная сям'я. Сухамлінскі меў рацыю са сваёй школай радасці. Ён у праслаўленную разруху і жабрацтва вучыў дзяцей іграць на флейце!

Не трэба хлусіць, што жыццё складаецца толькі з радасцяў. Здараецца і ў вопытнай маці момант, калі падаецца, што ўсе гэтыя клопаты нікому не патрэбныя і хочацца, як кажа Кундзікава, выць на Месяц... Што ж, да любові да дзяцей абавязкова павінна дадавацца цярплівасць і ўменне дараваць.

Але ў дом зноў прыходзіць свята. Нядаўна адна з дачок Кундзікавай пайшла замуж: урачыстасць была дома, усё рабілі самі і павесяліліся на славу. Іншая дачка, цяжарная, паспела добра патанчыць на тым вяселлі, а на наступны дзень нарадзіла Маргарыце Уладзіміраўне яшчэ аднаго ўнука.

Аднойчы ў доме разбралі старыя сшыткі на макулатуру, і выпадкова маці знайшла старое сачыненне Ягора, які атрымаў заданне напісаць сябру, а ён напісаў сваім продкам.

«У кожнай сям'і ёсць радавое дрэва. Наша дрэва магутнае і трывалае. Мноства продкаў у нашым радаводзе праслаўлялі і ўмацоўвалі яго. А цяпер у ім перапляліся мноства галінак, адарваных ад іншых радавых дрэваў. Перапляліся так, што немагчыма зразумець, дзе чые. Прыміце іх, продкі! Дайце сваю сілу і мудрасць. Няхай новыя парасткі прыносяць радасць і гордасць вам і наступным пакаленням. Каб іх дзеці не засталіся без роду і без племені».

Памылак у гэтым сачыненні было мноства, але настаўнік на ўсю старонку паставіў дзіцяці вялізную дзясятку.

Ілона ІВАНОВА,
Клічаўскі раён.

Надзённае

Васіль ЖАРКО:

«МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ЛІЧЫЦЬ МАГЧЫМЫМ АДНАЎЛЕННЕ НАВУЧАННЯ Ў ШКОЛАХ З 9 ЛІСТАПАДА»

Міністэрства аховы здароўя лічыць магчымым аднаўленне навучальнага працэсу ў школах краіны з 9 лістапада. Аб гэтым паведаміў журналістам міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО.

На думку міністра, вельмі правільна і своечасова было прынята рашэнне аб прадаўжэнні канікулаў. Гэта дало магчымасць разлучыць дзяцей і лакалізаваць эпідэміялагічны працэс. «Думаю, што ў панядзелак дзеці пойдуць у школу», — сказаў Васіль Жарко. Ён падкрэсліў, што каранцін пакуль уводзіць не плануецца. «Кожны галоўны ўрач раёна і вобласці надзелены правам самастойна вырашаць, ці трэба ўводзіць каранцін. Калі неабходна, можна зрабіць гэта выбарачна — у асобнай школе або ў раёне», — сказаў кіраўнік Міністэрства аховы здароўя.

Васіль Жарко падкрэсліў, што пакуль няма падстаў для аб'яўлення эпідэміі грыпу ў Беларусі. Цяпер прыняты толькі абмежавальныя меры, каб не дапусціць паўсюднага распаўсюджвання ВРВІ і грыпу.

Вытворчасць дадатковых партый «Арпетолу» беларускія прадпрыемствы пачнуць 9 лістапада. «У сувязі з тым, што на айчынных прадпрыемствах уся субстанцыя для выпуску «Арпетолу» была выкарыстана, сёння развезены па аптэках «Арбідол» расійскай вытворчасці. Заўтра будзе пастаўка расійскага, а ў панядзелак, 9 лістапада, пачнецца напрацоўка нашага», — сказаў міністр. Васіль Жарко таксама адзначыў, што ў Беларусі ёсць шмат айчынных супрацьвірусных прэпаратаў, у прыватнасці «Рэмантадзін».

БЕЛТА.

СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА — СУПРАЦЬ ПАНДЭМІЧНАГА ГРЫПУ

Для аператыўнага маніторынгу за эпідэміялагічнай сітуацыяй і кантролю за аказаннем медыцынскай дапамогі пацыентам з вострымі рэспіраторнымі інфекцыямі і пнеўманіяй у галоўным медыцынскім ведамстве нашай краіны быў створаны аператыўны штаб пад кіраўніцтвам міністра аховы здароўя Васіля Жарко. Пасяджэнні штаба праводзяцца двойчы на дзень з прыцягненнем спецыялістаў РУП «Белфармацыя» і іншых спецыялістаў.

Спецыялісты канстатуюць: захваральнасць на вострыя рэспіраторныя інфекцыі на 70 працэнтаў перавышае паказчыкі за аналагічны перыяд мінулага года. У Мінску 4 лістапада па медыцынскую дапамогу звярнуліся з прастуднымі сімптомамі больш за 11 тысяч чалавек. Дыягназ «грып» пастаўлены 2934 пацыентам. У стацыянары былі шпіталізаваныя 161 чалавек. Лабараторна пацверджана 85 выпадкаў захворвання на свіны грып. Адначасова з гэтым назіраецца рост захваральнасці на пнеўманію. У дзённы момант на стацыянарным лячэнні знаходзяцца 2154 чалавекі, у некаторых з пацыентаў назіраецца цяжкае працяканне хваробы. Па стане на 5 лістапада пнеўманія стала прычынай смерці 19 беларусаў, у 7 з іх была лабараторна пацверджана наяўнасць віруса грыпу A/H1N1.

У Міністэрстве аховы здароўя нарэшце, прызналі, што праблемы з забеспячэннем аптэк супрацьвіруснымі сродкамі ўсё ж такі ёсць: гэта датычыцца галоўным чынам арпетолу, арбідолу, аксалінавай мазі і масак. Аднак з ажыятажным попытам было складана справіцца. Так, 2 лістапада праз аптэчную сетку было рэалізавана 63,3 тысячы ўпаковак беларускага арпетолу. Да гэтага часу максімальны расход арпетолу ў аптэках быў зафіксаваны падчас апошняй эпідэміі ў лютым гэтага года — 9 тысяч упаковак за дзень. 3 лістапада прадпрыемствам было адгружана яшчэ 18 тысяч упаковак арпетолу, толькі ў дзяржаўную аптэчную сетку Мінска было пастаўлена 16 тысяч упаковак. У Міністэрстве аховы здароўя паведамляюць, што ў найбліжэйшыя дні на «Лекфарм» паступяць 600 кілаграмаў субстанцыі для вытворчасці арпетолу: з 10 лістапада і да канца месяца будзе выпушчана каля 600 тысяч упаковак гэтага прэпарату. Прадпрыемства збіраецца працаваць у тры змены, выпускаючы па 50 тысяч упаковак штодня.

Таксама РУП «Белфармацыя» ўжо вырашыла пытанне закупкі расійскага прэпарату «арбідолу» (аналаг беларускага арпетолу). 6 лістапада аптэкі атрымаюць 100 тысяч упаковак гэтага прэпарата. Што датычыцца таміфлю, то яно ёсць у наяўнасці ў арганізацыях аховы здароўя і на аптэчных складах і адпускаецца арганізацыям аховы здароўя па меры неабходнасці. Апошняя паставка таміфлю была 4 лістапада — у колькасці 2 тысяч упаковак. А на працягу лістапада ў Беларусь будзе пастаўлена яшчэ 30 тысяч упаковак таміфлю, 2 тысячы — на наступным тыдні.

Па стане на 4 лістапада ў аптэках Мінска ў наяўнасці было 23 тысячы ўпаковак рэмантадзіну. На РУП «Белмедпрэпараты» мелася яшчэ 45 тысяч упаковак. Да 17 лістапада плануецца выпусціць яшчэ 270 тысяч упаковак рэмантадзіну, але магчымасці завода дазваляюць выпусціць пры необходнасці 350—400 тысяч упаковак. Таксама «Белмедпрэпараты» плануюць выпусціць 650 тысяч упаковак аксалінавай мазі. Пачынаючы з 6 лістапада кожныя 2 дні будуць адгружацца па 20 тысяч упаковак.

Сітуацыю з наяўнасцю медыцынскіх масак у Міністэрстве аховы здароўя таксама абяцаюць нармалізаваць. За чатыры дні (з 30 кастрычніка па 2 лістапада) аптэкі атрымалі каля 100 тысяч масак, і ўсе яны былі раскупленыя. 3 лістапада былі пастаўлены яшчэ 90 тысяч штук. 4 і 5 лістапада аптэкі павінны былі атрымаць дадаткова 100 тысяч масак...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ВЫРАБ ГІГІЕНІЧНЫХ МАСАК ПАЧАЎСЯ Ў МАГІЛЁВЕ

5 лістапада ААТ «Стужка» выпусціла першую партыю гігіенічных масак, прызначаных для абароны чалавека ад розных інфекцый. Магілёўскае прадпрыемства вырабляе маскі з бінтоў уласнай вытворчасці. Мяркуецца штодня вырабляць 10 тысяч масак. Сярэдні кошт адной — каля тысячы рублёў.

«Стужка» будзе пастаўляць маскі ў медыцынскія ўстановы Магілёва і аптэкі. Першая партыя паступіла ў распараджэнне прадпрыемства «Фармацыя». Магілёўскія маскі белага колеру і, у адрозненне ад імпартных, якія з'яўляюцца аднаразовымі і прыдатныя толькі на некалькі гадзін, гэтыя можна шмат разоў мыць альбо прасаваць з парай, і карыстацца далей.

Ілона ІВАНОВА.

ІНШАМАРКІ: пакуль усё без зменаў

Праект Мытнага кодэкса Адзінага мытнага Саюза Беларусі, Расіі і Казахстана ўжо распрацаваны, і, як чакаецца, падпісанне гэтага дакумента можа адбыцца 27 лістапада ў Мінску

Як адзначыў **начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Мікалай БУРШ**, апошнім часам для спрыяння знешняму гандлю быў прыняты шэраг рашэнняў. Адно з іх датычыцца добрасумленных удзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці. Сёння гэты статус маюць больш як 500 прадпрыемстваў. Прычым іх прывілеі павінны павялічыцца. У прыватнасці, гаворка ідзе тым, што ў будучыні такія суб'екты гаспадарання змогуць дастаўляць тавары не на пункт мытнага афармлення, а непасрэдна на сваю вытворчасць. У выпадку паступлення папярэдняй інфармацыі аб таварах мытныя органы не будуць патрабаваць ад добрасумленных удзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці дадатковых пацвярджальных дакументаў.

Не менш важны крок — пашырэнне электроннага дэкларавання. Літаральна апошнім часам з'явілася магчымасць праводзіць гэту працэдуру ў дачыненні не толькі экспарту, але таксама — у дачыненні да часовага вывазу і рээкспарту. Урэшце, актывізацыі гандлю павінен паспрыяць і Адзіны мытны Саюз Беларусі, Расіі і Казахстана. Саюз мяркуецца ўтварыць з 1 студзеня наступнага года.

Начальнік упраўлення тарыфнага рэгулявання і мытных плацяжоў ДМК Сяргей ПОЛУДЗЕНЬ заўважыў: пакуль усе новыя стаўкі і пошліны будуць датычыцца юрыдычных асобаў. Што ж да правілаў увозу тавараў і аўтамабіляў фізічнымі асобамі, то тут з 1 студзеня ўсё застанецца па-ранейшаму. Цяперашнія нормы нацыянальнага заканадаўства будуць дзейнічаць да прыняцця іншых рашэнняў.

У сваю чаргу распрацоўка дакумента, які будзе рэгуляваць увоз тавараў і транспартных сродкаў фізічнымі асобамі ў рамках Адзінага мытнага Саюза, запланавана на 2010 год. Пакуль правілы ў Беларусі, Расіі і Украіне тут сапраўды адрозніваюцца і іх «выраўноўванне» — справа трохбаковых беларуска-расійска-казахстанскіх перамоў. Разам з тым у ДМК заўважаюць: агульныя нормы могуць з'явіцца да ліпеня наступнага года. Не выключана, што з гэтага ж часу знікнуць і пункты прыняцця паведамленняў на расійскай мяжы. У перспектыве ўсе працэдуры па часовым увозе транспартных сродкаў будуць выконвацца на знешняй мяжы дзяржаў—удзельніц Адзінага мытнага Саюза.

Сяргей ГРЫБ.

НАЦЫЯНАЛЬНАМУ МАСТАЦКАМУ МУЗЕЮ — 70 ГАДОЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі з 70-годдзем з дня заснавання музея.

У віншаванні гаворыцца, што за мінулыя дзесяцігоддзі гэта ўнікальная культурная ўстанова ператварылася ў галоўную скарбніцу бясцэннай мастацкай спадчыны, стала цэнтрам навуковай і асветніцкай дзейнасці, міжнародных сувязяў з вядучымі музеямі свету.

«Сёння калектыў музея самааддана працуе на карысць Радзіме, захоўвае духоўныя дасягненні айчыннай і сусветнай культуры, папулярызуе беларускае мастацтва ў нашай краіне і за мяжой, уносіць важкі ўклад у эстэтычнае выхаванне грамадзян», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Абзац

Памяць пра Уладзіміра Караткевіча будзе ўвекавечаная ў Кіеве. Учора там прайшла закладка памятнага каменя на месцы стварэння помніка выбітнаму беларускаму пісьменніку. Як адзначыў міністр культуры Павел Латушка, лёс Караткевіча доўгі час быў звязаны з Украінай. Вучоба на рускім аддзяленні філалагічнага факультэта Кіеўскага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі стала для будучага пісьменніка і гісторыка перыядам яго творчага і жыццёвага станаўлення як асобы.

Даходы бюджэту Мінска ад правядзення аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў у 2007-2009 гадах склалі Br32,8 млрд.

У Мінскай вобласці з'явіцца свая рэзідэнцыя Дзеда Мароза, паведаміла ўчора журналістам намеснік начальніка ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінаблвыканкама Алена Брок. Яна адзначыла, што не ва ўсіх ёсць магчымасць дабрацца да Белавежскай пушчы, дзе жывуць беларускія Дзед Мароз і Снягурка, а многім дзецям хочацца пабываць у іх у гасцях. Таму ў сталічным рэгіёне вырашана таксама стварыць церамок Дзядулі Мароза, які размесціцца ў Маладзечанскім раёне.

**Жыхарка вёскі Смальяны Аршанскага раёна прадала сваю дачку за $200, паведамілі БЕЛТА ў пракуратуры Віцебскай вобласці. Гора-маці прадала расіянцы сваю дачку 1995 года нараджэння ў перыяд з 2001 па 2003 год, аднак выяўлены г

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.19	16.26	9.07
Віцебск —	7.13	16.11	8.58
Магілёў —	7.10	16.16	9.06
Гомель —	7.01	16.18	9.17
Гродна —	7.34	16.42	9.08
Брэст —	7.29	16.48	9.19

Месяц

Апошняя квадра 9 лістапада. Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Апанаса, Івана, Мікалая, Пятра.*

К. *Хрысціны, Леанарда, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

6 лістапада

1751 год — завяршылася будаўніцтва Гродзенскага новага замка (каралеўскага палаца). Пабудаваны ў стылі сталага барока па замове караля Аўгуста III на месцы Гродзенскага Ніжняга замка.

1932 год — на выбарах у германскі рэйхстаг большасць галасоў атрымала партыя нацыстаў Гітлера.

Цытата дня:

«Прырода прадаставіла нам часовае прыстанішча, але не пастаяннае жыллё».

Цыцэрон Марк Тулій (106 да н.э — 43 н.э.), старажытнарымскі палітык і пісьменнік.

ОАО «НАФТАН»

РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (С ПОВЫШЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ)

АВТОВЫШКУ 30 м на базе КАМАЗ 53213 1988 г.в.,

начальная цена 50 млн руб.

Предложения принимаются по адресу:
211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101 с пометкой «Конкурс, автовышка» до 7 декабря 2009 года.
Извещение размещено на сайте **www.naftan.by.**

УНП 300042199

ВЕТЭРАНСКАЕ БАГАЦЦЕ

У Асіповіцкім раёне расследуецца крымінальная справа аб крадзяжы медалёў у ветэрана. У міліцыю звярнуўся 82-гадовы жыхар вёскі Вяззе: пакуль дзядуля быў у бальніцы, дзверы яго дома ўзламалі і скралі пінжак, на якім было 11 медалёў. Дзесяць са скрадзеных медалёў — юбілейныя, а адна — «За Перамогу над Германіяй». Падазрэнне ветэрана пала на 27-гадовага мужчыну, які часова жыў у яго доме. Рэч у тым, што гэты малады чалавек неаднаразова асуджаўся, толькі што выйшаў з калоніі. Пакуль шукаў жыллё, перабіваўся ў дзеда начлегам і, відаць, прыглядаўся да каштоўных рэчаў. Самымі каштоўнымі ў доме аказаліся ветэранскія медалі...

Алена КАЗЛОВА.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (4 лістапада). По гарызанталі: Макулатура. Плод. Ясон. Сад. Гаць. Купец. Вера. Ігар. Сет. Адрас. Чайхана. Люк. Дан. Апад. Кіншаса. Лапта. Парык. Зара. Кардон. Вона. «Атас». Радар. Клас. Падкоп. Кіно. Самакат. Пудзель. **По вертыкалі:** Міцкевіч. Піла. Дрэйф. Нара. Шпат. Салдат. Алупка. Авеню. Сакс. Мопс. Такса. Кадка. Лось. Рол. Кіт. Крона. Азон. Дог. Бокс. Поп. Крачка. Права. Парода. Род. Адрына. Шпіц. Сон. Карамель.

Сканворд (5 лістапада). По гарызанталі: Ваколіца. Сажалка. Долата. Вятрак. Радос. Вір. Астра. Эмір. Вадарод. Рух. Аброк. Акра. Рапс. Фігаро. Схема. Паз. Ірак. Кілім. Сабака. Ван. Інтрада. Цана. Бах. Нарач. Фры. Сталіца. Пляцень. **По вертыкалі:** Журавель. Асфальт. Дудар. Хіба. Афера. Сіроп. Макі. Інд. Стакан. Ягада. Туба. Атлет. Арфа. Ротар. Архар. Сотка. Чып. Кварк. Каа. Міні. Рэха. Крапіва. Сідр. Раман. Абоз. Надфіль.

«СТАРТАВАЛІ» НОВЫЯ СЕРЫІ МАНЕТ

З сённяшняга дня Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць у абарачэнне памятныя манеты новай серыі «Народныя промыслы і рамёствы беларусаў» — «Саломапляценне», паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Сярэбраная памятная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 33,62 грама, медна-нікелевая — 1 рубель. Адчаканеныя яны на ЗАТ «Літоўскі манетны двор»: сярэбраная якасцю «пруф», медна-нікелевая — «пруф-лайк». Тыраж і сярэбранай, і медна-нікелевай манет складае па 5000 штук кожнай.

Таксама Нацыянальны банк Беларусі ўвёў у абарачэнне манеты «Казярог» серыі «Знакі задыяка». Сярэбраная манета выпушчана наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 28,28 грама, медна-нікелевая — наміналам 1 рубель. На памятнай сярэбранай манеце на адваротным баку размешчана ўстаўка з сінтэтычнага крышталя. Манеты адчаканеныя на АТ «Манетны двор Польшчы»: сярэбраная — якасцю «анцыркулейтэд, аксідзіраваная», медна-нікелевая — якасцю «брыльянт-анцыркулейтэд». Тыраж сярэбранай манеты складае да 25 000 штук, медна-нікелевай — 10 000.

Ігар ГРЫШЫН.

З НАЖОМ — ПА КАСАВУЮ ВЫРУЧКУ

У Оршы ўвечары ў краме «Усходні», што па вуліцы Міру, навед-вальнік з нажом у руцэ патрабаваў аддаць касавую выручку. На той час у касе было паўмільёна рублёў.

Грошы патраціць ён не паспеў. Літаральна праз некалькі хвілін пра нападз крамы паведамілі ў міліцыю. Злодзея, як кажуць, затрымалі па гарачых слядах. Высветлілася, што ён — беспрацоўны мясцовы жыхар. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЛЮСТЭРКА

Спрыяльны ЛЕЎ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Юная мінчанка Марына Калечыц на Інтэрнацыянальнай вуліцы сталіцы каля адзінай у горадзе скульптуры льва. Як і многія маладыя жыхары Мінска яна верыць, што сустрэча ля бронзавага цара звяроў прыносіць удачу і дадае ўпэўненасці ў сабе.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 8 декабря 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	проспект Витебский, ост. «Автозавод им. С.М. Кирова» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№1) в остановочном павильоне	740100000007004846	28 000	3 000
№ 2	проспект Витебский, ост. «Автозавод им. С.М. Кирова» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне	740100000007004847	28 000	3 000
№ 3	улица Габровская, ост. «Бульвар Непокоренных» (от центра)	0,0017	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005004253	100 000	9 000
№ 4	проспект Димитрова, ост. «АТС-42» (в центр)	0,0018	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000006002469	71 000	6 000
№ 5	улица Королева, ост. «Торговый дом «Баден» (от центра)	0,0011	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000004003202	67 000	6 000
№ 6	Минское шоссе, ост. «Улица Калиновского» (в центр)	0,0007	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000001005271	25 000	2 000
№ 7	проспект Мира, ост. «БРУ» (огран. – р. Дебря)	0,0010	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне	740100000004003206	75 000	7 000
№ 8	проспект Мира, ост. «БРУ» (огран. – р. Дебря)	0,0010	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 3) в остановочном павильоне	740100000004003207	75 000	7 000
№ 9	проспект Пушкинский, ост. «Гостиница «Турист» (в центр) (огран. – р. Днепр)	0,0014	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005004212	51 000	5 000
№ 10	проспект Пушкинский, ост. «Улица Габровская» (в центр)	0,0015	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне	740100000006002468	70 000	6 000
№ 11	проспект Пушкинский, ост. «Улица Габровская» (в центр)	0,0014	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне	740100000006002467	65 000	6 000
№ 12	проспект Пушкинский, ост. «Улица Островского» (от центра) (№ 1)	0,0026	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торговых киосков остановочном павильоне	740100000005004251	152 000	14 000
№ 13	проспект Пушкинский, ост. «Универмаг «Октябрьский» (в центр)	0,0013	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне	740100000006002466	61 000	5 000
№ 14	Чаусское шоссе, 4 (условие: перенос части кап. забора)	0,0088	1 год	Установка и обслуживание склада из легкосборных конструкций	740100000007004837	138 000	12 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

3) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона,** в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная (общая) сумма затрат (на победителей) составляет 14 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 02.12.2009 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

Ківі: свята пахаў

Смак гэтага плода шматгранны і вытанчаны. Ён увабраў у сябе пахі дыні, агрэсту, суніц, банана, кавуна, ананаса і «сумясціў» усе іх карысныя ўласцівасці.

Вучоныя правялі цікавае даследаванне: пратэставалі 27 найменняў самай папулярнай садавіны і агародніны і зрабілі выснову, што самае карыснае з іх для нашага здароўя — ківі. У сярэднім яно змяшчае 75 мг вітаміну С, 2,6 г клятчаткі, 295 мг жалеза.

ЧЫМ КАРЫСНАЕ КІВІ

Для сардэчна-сасудзістай сістэмы. Багатае на аскарбінавую кіслату, якая ўмацоўвае сценкі крывяносных сасудаў, паніжае рызыку кровазлівання, нармалізуе ціск. Па яе колькасці адзін плод ківі роўны двум апельсінам. Дарэчы, калі вы будзеце з'ядаць хоць бы адзін маленькі плод у дзень, то цалкам пакрыеце патрэбнасць арганізма ў гэтым вітаміне. Вялікая колькасць (295 мг) «сардэчнага» мінералу калію (ён адказвае за водна-салявы абмен у арганізме, папярэджвае ацёкі), робіць ківі незаменным прадуктам для бесперабойнай работы міякарда.

Для імуннай сістэмы. Павышае супраціўляльнасць арганізма да розных інфекцый, дазваляе лягчэй пераносіць прастудныя захворванні і паскарае працэс ачуньвання.

Для нервовай сістэмы. Змяшчае антыстрэсавы макраэлемент магній (240 мг), які актыўна паніжае ўзбуджальнасць нервовай сістэмы. Узмацняе працэсы тармажэння ў кары галаўнога мозга. А яшчэ гэты мінерал выдатна знімае мышачныя спазмы і напружанні.

Для кішэчніка. Пекцінавыя рэчывы, на якія таксама багатае ківі, набухаюць у кішэчніку, утвараюць асаблівыя слізістыя растворы. Яны выдатна ўплываюць на карысную мікрафлору, усмоктваюць шкодныя прадукты абмену рэчываў і своечасова выводзяць іх з арганізма.

Для крывятварэння. У мякаці ківі шмат хларафілу. Па сваёй хімічнай структуры ён блізкі да гемаглабіну. Уключаючы ківі ў свой рацыён харчавання, вы папярэдзіце развіццё анеміі, малакроўя.

Для фігуры. Гэта выдатная аснова для любой дыеты: у ківі — мінімум калорый (усяго 46!), затое максімум неабходных для арганізма вітамінаў і мінералаў, якія выводзяць шлакі і дапамагаюць скінуць лішнюю вагу.

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

На холадзе мы маладзеем

Прывыкайце спаць у халодным пакоі: хто спіць пры тэмпературы 17-18 градусаў вышэй за нуль, даўжэй застаецца маладым, бо абмен рэчываў у арганізме непасрэдна залежыць ад тэмпературы навакольнага асяроддзя.

Хваробы дрэннага характару

Мужчынам неабходна звярнуць увагу на свой характар. Сутнасць у тым, што чым старэйшымі яны становяцца, тым больш у іх шанцаў атрымаць астму, сардэчна-сасудзістыя захворванні, гіпертанію і сіндром раздражняльнага кішэчніка толькі па прычыне няўжыўчывага характару, бурклівасці і бурчання, раздражняльнасці. Мяняйцеся, пакуль яшчэ ёсць час!

Добры настрой — лякарства ад грыпу

Спецыялісты даўно заўважылі, што выццярадасныя людзі хварэюць радзей, а здаровая нервовая сістэма лёгка спраўляецца са шкоднымі фактарамі навакольля. Таму хутчэй пазбаўляйцеся ад змрочных думак, пабольш бывайце на свежым паветры, займайцеся па магчымасці спортам і як мага часцей усміхайцеся.

-2615-

ЗАНАТУЙЦЕ

Харчуйцеся па правілах

Многія з нас скардзяцца на стрэсы, стомленасць, дрэннае самаадчуванне. Часта гэта залежыць ад таго, як і што мы ядзім. Вельмі важна харчавацца правільна!

Правіла 1. Не накідвайцеся на ежу, як галодны воўк на бедную авечку. Гэта шкодна для арганізма. Ешце павольна, з пачуццём, з толкам, з расстаноўкай. Так вы намнога хутчэй заспакоіце голад. Памятайце: лепш недаесці, чым пераесці.

Правіла 2. Ешце паболей свежых і сырых прадуктаў, яны больш карысныя, чым тыя што паляжалі, і прыгатаваныя. Гэта датычыцца ў першую чаргу гародніны і садавіны. Даказана, што нават за адзін дзень знаходжання іх у халадзільніку губляецца больш за палову розных карысных рэчываў і вітамінаў.

Правіла 3. Складайце сваё меню ў залежнасці ад пары года. Гэта важна. Калі, напрыклад, летам можна лёгка абыходзіцца без мяса і хлеба, атрымліваючы асалоду ад вегетарыянскай кухні, то зімой без гэтых прадуктаў (не здзіўляйцеся!) можна лёгка набраць лішнюю вагу. Справа ў тым, што хлеб і мяса — крыніцы энергіі, якая так неабходная нам у холад для сагравання. Не атрымліваючы яе, вы будзеце пастаянна хацець есці, што вельмі шкодна для фігуры.

Правіла 4. Не перасольвайце стравы і не запівайце іх у час яды, асабліва шыпучымі напоямі. Дыетолагі раяць выпіваць палову шклянкі вады нашча перад сняданнем — такім чынам кішэчнік рыхтуецца да дзённай работы. Можна таксама выпіць невялікую колькасць вады непасрэдна перад ядой, калі баіцеся пераесці. Аднак у час прыёму ежы шклянку з вадой адстаўце ўбок. Таксама не рэкамендуецца ганяць чаі пасля абеду.

Правіла 5. Не гатуйце многа і не даядайце ўчарашняе. Нясвежыя прадукты засмечваюць арганізм таксінамі.

ДА ВАШАГА СТАЛА

Курыныя піражкі з бульбай

На 4 порцыі: *700 г бульбы, 350 г адвараната курынага мяса, 3 сцябліны зялёнай цыбулі, па 4 ст. лыжкі кансерваваных кукурузы і зялёнага гарошку, 1 салодкі перац, 1 яйка, 85 г паніровачных сухароў, 3 ст. лыжкі алею, зеляніна пятрушкі, соль, перац на смак.*

Абабраную бульбу зварыце ў падсоленай вадзе, пратрыце. Курынае мяса дробна пасячыце, злучыце з бульбай, дадайце ўсе астатнія інгрэдыенты, добра перамяшайце. Раздзяліце масу на 12 частак, сфармуйце піражкі прадаўгаватай формы. Абкачайце ў сухарах і абсмажце на алеі да залацістага колеру.

ДРОБНЫ РАМОНТ

Выратоўваем дзверцы шафы

Яны сталі заядаць ці адчыняюцца самі па сабе? Прычын у гэтага можа быць некалькі, аднак паспрабуем хутка вырашыць гэтыя праблемы.

Калі шафа знаходзіцца ў няўстойлівым становішчы, падкладзіце пад ножкі кардонкі ці тонкія драўляныя пласцінкі. Пад вялікімі і цяжкімі шафамі іншы раз прасядае падлога, таму дзверцы заклініваюць. У гэтым выпадку пад сярэдзіну шафы ўбіце дзве драўляныя цуркі так, каб іх не было бачна спераду.



Калі шарнірныя завесы расхісталіся і аслаблі, дзверцы могуць правіснуць і іх можа таксама заклініць. У першую чаргу трэба падцягнуць усе вінты. Калі яны ў драўніне ўжо не трымаюцца, трэба ўкруціць новыя, больш доўгія, наколькі дазваляе таўшчыня дзверцаў. Калі гэта немагчыма зрабіць, у старыя адтуліны трэба ўклеіць кавалачкі запалак ці запоўніць адтуліны замазкай для драўніны. Калі яна высахне, зноў укруціце вінты, і дзверцы вернуцца ў зыходнае становішча.

Калі зашчапка, якая трымае дзверцы ў зачыненым становішчы, зрушылася з-за таго, што дзверцы правіслі, прыкруціце яе на новае месца.

-2616-

КАШТОЎНЫЯ МЕТАЛЫ

Медзь — чырвона-аранжавы метал стаў сімвалам зямнога святла і цяпла, а таксама асацыяваўся з моцным здароўем: «Дарую вам медзі, каб дзеці былі, як мядзведзі». Менавіта з медзі выраблялі грошы.

Нашы продкі лічылі, што з дапамогай медзі багі дораць людзям здароўе і выкарыстоўвалі гэты метал з лекавымі мэтамі. Чыстую медзь засыпалі ў раны, тым самым папярэджваючы шматлікія інфекцыйныя захворванні. Сёння навукоўцы даказалі, што гэты метал сапраўды з'яўляецца цудоўным танізуючым сродкам для печані і лімфатычных вузлоў. З гэтай нагоды нашы продкі насілі бранзалеты з медзі на руках і нагах.

З медзі выраблялі бубны і званочкі, якія выкарыстоўвалі ў народных рытуальных дзеяннях. Іх звон павінен быў «ачысціць» дарогу ад нячыстай сілы. Таксама медзь выкарыстоўвалі для вырабу царкоўных званоў.

Медныя манеты клалі ў ложак маладым, каб забяспечыць ім працяглае сумеснае жыццё і здаровых дзяцей.

Жалеза ў гісторыі чалавецтва з'явілася значна пазней за іншыя металы. З-за яго магчымасці ржавець стаўленне да яго ў народнай культуры было некалькі насцярожаным. Іржу параўноўвалі з крывёй, якая выступае на целе чалавека.

У той жа час шматлікія магічныя дзеянні трэба было выконваць у прысутнасці толькі гэтага металу: маляваць магічныя кругі, адкопваць лекавыя карані.

Лічылася, што амулеты і ўпрыгажэнні з жалеза ахоўваюць чалавека ад нячыстай сілы. Цікавым бачыцца і той факт, што Царква з пачатку VII стагоддзя забараняла насіць такія ўпрыгажэнні на целе. Але ў народзе і сёння існуе вера ў моц шпількі, якую прышпільваюць да вопраткі ў патаемным месцы, ці падковы, якая прыбіта пры ўваходзе ў хату.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дарагую сястрычку **Таццяну Аляксееўну КУЦКІНУ** віншуем з днём анёла.

Желаем на все годы безоблачной погоды,
Ни капельки ненастья,
Любви, здоровья, счастья.

Твае сёстры, браты, пляменнікі, *г.п. Лёзна.*

Усміхнемся!

Калі вы чхнулі і пачулі ад калег злоснае «Будзь здаровы!», варта хутка адказаць: «Заўсёды здаровы!»

☺

Навуковае судна ўжо не першы месяц боўтаецца ў моры, народ пакрысе пачынае піць. Капітан вырашыў гэтую справу спыніць і сабраў каманду:

— Значыць так, у сувязі з частымі выпадкамі п'янства загадваю: усю гарэлку — за борт!

Павісла мёртвая цішыня. І раптам аднекуль з задніх радоў даносіцца:

— А што, праўду кажа капітан, сапраўды даўно трэба ўсю яе за борт!

Каманда ўзрываецца ад абуранасці:

— Вадалазам слова не давалі!

☺

Матацыкліст на дарозе — як ваўкалак: у люстэрку не адлюстроўваецца.

☺

Дзве сяброўкі:

— А мне прынц патэлефанаваў!

— Памыліўся нумарам?



У сувязі са святамі наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў аўторак, 10 лістапада.

ЗВЯЗДА 6 лістапада 2009 г.

ЗАХАВАЦЬ ТОЕ, ШТО МАЕШ, І ІСЦІ ДАЛЕЙ

На пытанні спецыяльнага карэспандэнта «Звязды» адказвае старшыня Баранавіцкага гарвыканкама Віктар ДЗІЧКОЎСКІ

— Віктар Іванавіч, як эканоміка горада жыве ва ўмовах прыўнесенага крызісу? Кіраўнікам калектываў даводзіцца складана?

— Калі на пачатку гаварыць безадносна да горада, то ў любы крызіс цяжка ўсім, але асабліва складана таму, хто і ў нармальных умовах не да канца разумее, што ён робіць, і не ўмее ўсвядомлена працаваць. А мы разумеем, што робім, цалкам гэта ўсведамляем. Вы пытаецеся, што канкрэтна прадпрымаем у новых умовах? Перш за ўсё, дыверсіфікуем эканоміку горада. Нацэльваем прадпрыемствы на выпуск новых відаў прадукцыі і на пошук новых рынкаў збыту. Напрыклад, тыя прадпрыемствы горада, якія былі зарыентаваны на расійскі машынабудаўнічы комплекс — а ён сёння амаль што спынены — мы перанацэлілі на рынкі Еўрасаюза, для чаго сертыфікавалі пад іх рынак прадукцыю. І зараз маем шмат распрацовак, якія будуць запатрабаваны ў розных краінах. Асвойваем таксама ўсходні кірунак, у тым ліку Індыю, Кітай, Егіпет, Нігерыю, Іран, Венесуэлу — з некаторымі з гэтых краін супрацоўнічалі і раней, але не вельмі актыўна.

Сёння разам з кіраўніцтвам і калектывамі прадпрыемстваў працуем перш за ўсё над тым, каб яны скарацілі свае затраты і дзякуючы гэтаму змаглі знізіць цэны. Задача не з простых, асабліва калі назіраецца зніжэнне аб'ёмаў. У пэўнай ступені дапамагло тое, што на шэраг сыравінных матэрыялаў цэны ў крызісных умовах знізіліся, і гэта станоўча паўплывала на зніжэнне сабекошту.

У горадзе прадметна і сістэмна ідзе праца над выкананнем Дырэктывы Прэзідэнта № 3 аб эканоміі, беражлівасці, эфектыўнасці работы ўсяго народнагаспадарчага комплексу. Істотна скарацілі энергазатраты, па аб'ёму прыбытку ў цэлым па горадзе маем прырост. А як вядома, прыбытак — паказчык інтэграваны. За адпаведны перыяд года нікому не знізілі заработную плату, на асобных прадпрыемствах нават маем яе прырост. Праўда, вельмі нязначна знізілася рэнтабельнасць — была 13, стала 12,7. Зразумела, чаму. Тым не менш, сёння на пасяджэнні выканкама яшчэ раз прааналізавалі, што можна зрабіць, каб не дапусціць падзення надалей.

Кіраўнікі калектываў на выканкаме паднялі пытанне аб тым, што калі мы выходзім на рынкі Еўрасаюза, то павінны быць прыняты меры па зніжэнні падатковай нагрузкі на прадукцыю, якая пойдзе ў гэтым накірунку. Рынкі для нас новыя, і ў Еўропе ніхто нас не чакае з сяброўскімі абдымкамі. Там хапае ўласных вытворцаў, у якіх тая ж эканамічная сітуацыя.

Калі ўлічыць, што цяпер на сусветных рынках цэны на асноўныя матэрыялы знаходзяцца практычна на адным узроўні, рэальнай перавагай прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь з'яўляецца больш нізкі кошт работ (паслуг). Удзельная вага кошту работы ў гатовым вырабе нашага вытворцы займае ў сярэднім 20 працэнтаў (астатняе — сыравіна і матэрыялы). З улікам выплаты пакупніком мытнай пошліны на гатовы выраб 2,7 працэнта кошт работы ў цане вырабу ўзрастае да 23 працэнтаў. Прадукцыя становіцца неканкурэнтаздольнай у краінах ЕС. Так што прапанова прадстаўнікоў дырэктарскага корпусу здаецца слушнай.

Фактычна ў нас адзінае выйсце: узяць якасцю і цаной, а яшчэ — стабільнасцю пастаўкі. Нашы дзелавыя партнёры на Захадзе вельмі ўважліва вывучаюць вось гэтыя тры складальнікі, тры «кіты», на якіх могуць паспяхова будавацца нашы гандлёвыя і іншыя ўзаемаадносіны.

Да слова, зараз разам з патэнцыйнымі замежнымі інвестарамі збіраемся запусціць уласную вытворчасць па выпуску жалезабетонных элементаў для буйнапанэльнага домабудавання з вектарам пастаўкі ў Расію. Там у хуткім часе будуць запатрабаваны нашы найноўшыя тэхналогіі.

Ад кожнага кіраўніка, незалежна ад формы ўласнасці, сёння як ніколі патрабуем эфектыўнай работы. Нас цікавіць, што канкрэтна зарабляюць людзі ў калектывах. Прывяду такі прыклад. Баранавіцкая абутковая фабрыка па сутнасці стала прыватнай, там няма дзяржаўнай уласнасці. Яе кіраўнік сёння дакладваў: распрацавалі такі асартымент прадукцыі, які карыстаецца попытам. І сапраўды, я нядаўна быў на беларускай ярмарцы ў Сонцаўскім раёне Масквы. І калі мы пачалі прадаваць там сваю прадукцыю, у тым ліку баранавіцкі абутак, эфект быў для нас крыху нечаканым. Усе машыны, якія прывозілі тавар «на паказ», пайшлі назад пустымі. А вытворцы прывезлі дамоў чамадан грошай. Масквічы былі ўдзячныя нам і прасілі, каб на Каляды, пад Новы год прыехалі зноў. Асабіста да мяне падыходзілі і казалі: вось мы купілі зараз прыгожы, якасны і танны абутак. Купілі вашы цудоўныя прадукты. А кансерваваную прадукцыю, асабліва агуркі, разабралі ў першыя ж гадзіны работы. Людзі стаялі ў чарзе, і гэта — ў Маскве! Восем тон бульбы прадалі ў першы ж дзень. Прывезлі б 80, то прадалі б і ўсе 80. На «ўра» пайшла малочная прадукцыя. З мясной вярнуліся назад толькі кансервы для катоў і сабак — мнагавата ўзялі, бо перад тым у Санкт-Пецярбургу народ без канца хадзіў якраз па іх. А ўсё астатняе прадалі ў Белакаменнай да апошняга кілаграма. Аб чым гэта сведчыць? Што мы запатрабаваныя. А з іншага боку — не ўмеем сістэмна працаваць на гэтым рынку, пра што я і сказаў кіраўнікам. Мы не ўмеем «рухаць» свой тавар не ў рамках асобных акцый, а каб штодзённа ў братнюю краіну ішлі фуры, каб наша прадукцыя кожны дзень пастаўлялася туды эшалонамі. Чаму яна там жаданая? Бо мы захавалі на яе яшчэ савецкія стандарты, а яны былі жорсткія і канкрэтныя, зарыентаваныя на натуральнасць прадукцыі. Гэты падыход захаваўся ў нас. А ў іншых вытворцаў, не ў крыўду ім будзе сказана, распрацаваныя замяняльнікі — і на колер, і на смак. Усё быццам законна, прадукцыя прыгожая, але смак іншы. Людзі гэта разумеюць і жадаюць атрымаць тое, што было раней.

Калі вярнуцца да тэмы абутку, то сёння на пасяджэнні выканкама кіраўнік фабрыкі інфармуе: у нас нармальныя вынікі, за 9 месяцаў — 103,6 працэнта. Я з ім не пагадзіўся, бо не атрыманы прыбытак, нізкая заработная плата. Выканкам запатрабаваў разгледзець работу кіраўніцтва фабрыкі на наглядальным савеце. Мы не ўмешваемся ў працу калектываў па дробязях, не дыктуем ім маркетынгавую ці асартыментную палітыку. Нам важна, каб яны ажыццяўлялі стратэгію, якая дазваляе ім працаваць прыбыткова, каб умовы працы людзей і зарплата былі нармальнымі.

— А якія ўсё ж формы ўплыву дзейнічаюць найчасцей?

— І адміністрацыйныя, і эканамічныя. Заслухоўваем справаздачы кіраўнікоў, а ў выпадку нездавальняючай працы дырэктар не атрымае свой заробак у поўным памеры. Мы не займаемся нейкімі надуманымі праверкамі альбо запалохваннем кадраў, нейкімі штрафамі. Але імкнёмся ведаць канкрэтную сітуацыю, каб дапамагчы вытворцу, адчыніць яму дзверы на рынкі, зрабіць яго бізнэс больш шырокім. Як кіраўнік будзе гэта рабіць — яго справа.

Заўтра адкрываем нашу рэгіянальную выставу «Баранавіцкая восень 2009». Удзельнічаюць у ёй практычна ўсе буйныя прадпрыемствы. Такія паказы садзейнічаюць добрай славе калектываў, развіццю дзелавога партнёрства, пашырэнню рынкаў.

— Вы сказалі: «Дапамагаем вытворцу раскрыць гарызонты». Якім чынам, якія сёння існуюць формы дапамогі? Бо працаваць павінен, мы так разумеем, не толькі адміністрацыйны патэнцыял выканкама...

— Не буду доўга расказваць, проста запрашаю вас прайсціся па гарадскіх вуліцах, і вы ўбачыце шмат невялікіх буцікаў. На такую іх масавасць мы пайшлі першымі ў вобласці, яшчэ да адпаведнага ўказа Прэзідэнта. Паверце, гэта было няпроста. Мы перавялі некамфортнае жыллё ў іншую катэгорыю, аддалі яго пад гандлёвыя пункты, і такім чынам стварылі людзям магчымасць рэалізоўваць не толькі разнастайны тавар, але і свае магчымасці, свае схільнасці, жыццёвыя планы. Чым не прыклад нашай дапамогі бізнэсу, гандлю, вытворцам? Чаму вытворцам? Сёння ў горадзе каля 90 працэнтаў усіх тавараў, што рэалізуюцца, айчыннай вытворчасці. Імпарт — толькі крытычны. Рыс не расце ў нашай краіне, мы яго мусім завозіць. Бананы не растуць, а попытам таксама карыстаюцца...

А калі разгарнуўся шырокі гандаль айчыннымі таварамі, то заканамерным стаў і іншы крок — мы пайшлі па шляху больш шырокай арганізацыі фірменнага гандлю. У фірменнай краме «ЭЛІЗ» шырока выстаўлена адзенне беларускага вытворцы, перш за ўсё мужчынскія кашулі. У краме «БЛІК» прадаецца якасны і параўнальна недарагі абутак добрасумленных айчынных вытворцаў. Адкрылі крамы фірмаў «МАРКА» і «СВІТАНАК». Учора ў мяне быў генеральны дырэктар баваўнянага аб'яднання, ставіць пытанне аб адкрыцці другой фірменнай крамы. Цяпер у цэнтры адкрываем «КЕРАМІН». А ўвогуле ў нас каля 60 крамаў фірменнага і ведамаснага гандлю. Самыя прэстыжныя месцы аддалі беларускаму вытворцу. Форма дапамогі, ці не так?

— А вы дапамагаеце атрымаць крэдыты? Зараз з гэтым становіцца складаней.

— У дзейнасць банкаў не ўмешваемся, можам толькі рэкамендаваць. Але з прычыны таго, што займаемся інвестыцыйнымі праектамі і кантралюем ход іх выканання, супрацоўнічаем і з банкаўскай сферай. Дарэчы, крыніцы крэдытавання бываюць розныя. На выканкаме трымаў справаздачу дырэктар малочнага камбіната, на якім ажыццяўляецца інвестыцыйны праект на ўласныя сродкі, больш чым на 20 мільярдаў рублёў з прыцягненнем больш як двух мільёнаў еўра так званага звязанага крэдыту з-за мяжы. Вось вам, калі ласка — і гэта сёння! Мы сустракаліся з інвестарам, паабяцалі яму льготныя ўмовы, выканалі свае абавязацельствы, і ў выніку ён прыйшоў да нас, і мы маем цяпер цудоўную вытворчасць.

Можа некага здзівіць, але распачынаем і новыя вытворчасці, у прыватнасці, стварылі яшчэ адно прадпрыемства — «ВІТАМІН», якое занятае выпускам сокаў. Прадукцыя пайшла на экспарт. У тым ліку і праз гандлёвыя сеткі санкт-пецярбургскай спецыялізаванай фірмы «ЭЛІТ-ПРАДУКТ», якая гандлюе не проста сокамі, а сокамі вядомых брэндаў, павышанай якасці, і гэта можна расцаніць як давер. Яны прыязджалі, прыцэньваліся, былі ў мяне, вялі перамовы, настойліва цікавіліся, ці будзе стабільная пастаўка, ці пастаянна стабільнай будзе высокая якасць. Мы цярпліва тлумачылі, што ў нас дзейнічае стандарт, прытрымлівацца якога павінна прадпрыемства любой формы ўласнасці, і гэта абавязковая ўмова існавання фірмы, яе паспяховасці. Нам паверылі і пачалі з намі працаваць.

— У гэтых не вельмі простых умовах вы рэкамендавалі прадпрыемствам рыхтаваць антыкрызісную праграму?

— Мы не проста рэкамендавалі, а напрыклад, у Калінінградзе ці Піцер, загадзя паведамлялі сваім партнёрам і запрашалі прыйсці на сустрэчу. А калі не маглі паехаць, усё адно ўдзельнічалі завочна — праз бюлетэнь і газеты, што распаўсюджваліся сярод удзельнікаў.

Гэта былі цяжкія дні, месяцы, нават кварталы. Ні для каго не сакрэт, што ў той час мы выжылі толькі дзякуючы падтрымцы кіраўніцтва краіны — бу-

На выставе «Баранавіцкая восень-2009» кіраўнікі горада разам з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Славацкай Рэспублікі ў Беларусі Марыянам СЭРВАТКА (у цэнтры) і другім сакратаром пасольства Андрэа МАЦКОВАЙ.

сваю вытворчасць так, як ён любіць самае запаветнае для сябе. Калі ён пачне так ставіцца да справы, грамадства будзе багацейшым і пераадолее любыя складанасці. Яны, дарэчы, былі ў любыя часы.

— У мэтах эканоміі людзей не звальняюць?

— Мы сабраліся з дырэктарскім корпусам і дамовіліся, што мы не будзем тузаць людзей без самай крайняй на тое неабходнасці. Іншая рэч, што частка людзей па ўласнай ініцыятыве «перацякае» ў іншыя сектары эканомікі з прадпрыемстваў, дзе зменшыліся заказы, значыць, і заробкі. Так сталася на тым жа аўтаагрэгатным заводзе. Была будаўнічая група чалавек з трыццаці, людзі не захацелі сядзець без справы і атрымліваць сімвалічныя дзвесце тысяч, перайшлі на будоўлі горада, дзе заробяць мільён. Я рэальна ацэньваю сітуацыю: так, у шэрагу калектываў існуе няпоўная загрузка людзей і абсталявання, адсюль і няпоўны заробак. Але ён, заробак, ёсць, і ён стабільны. Чалавек як ніколі адчуў, што калі ён працуе якасна і працуе многа, то атрымае за сваю працу вартае ўзнагароджанне.

— І якія прадпрыемствы ў сённяшніх няпростых варунках трымаюцца годна, дастаткова вынікова працуюць і не збіраюцца выкідваць белыя сцягі?

— Калі не займацца ідэалізацыяй, бо сітуацыя пераменлівая, то нармальна і стабільна працуюць прадпрыемствы недзяржаўнай формы ўласнасці, многія з якіх мы ўжо сёння называлі. У нас іх больш за трыста. Яны перабудавалі сваю дзейнасць, дыверсіфікаваліся. У іх ліку шэсць ці сем прыватных мэблевых прадпрыемстваў. Яны працуюць нармальна. Магу назваць «Лагуну». Частка яе прадукцыі прамым прызначэннем ідзе за межы краіны. На апошняй мэблевай выставе ў Мінску «Лагуна» выставілася на 200 квадратных метрах і паказала, на мой погляд, найлепшую калекцыю ў краіне.

— А гэта праўда, што Баранавічы — «мэблевая сталіца» Беларусі?

— Ведаеце, мы сабе такога тытула не надавалі, але калі народная пагалоска яго нам прысвоіць, пярэчыць не будзем. У нас ёсць такія прыватныя мэблевыя прадпрыемствы, як «Явід», «Тры кароны», «Тымбер» і некаторыя іншыя, яны выпускаюць сучасную прадукцыю, якая карыстаецца попытам. Можаце звярнуць увагу: уся мэбля майго працоўнага кабінета выраблена ў Баранавічах. І прычына не ў адным толькі патрыятызме, хоць я, безумоўна, патрыёт горада.

Калі вы ехалі да нас, то маглі бачыць насупраць новага лядовага палаца яшчэ адну вялікую новабудоўлю — гэта фірма «Явід» узводзіць буйны гандлёва-рознічны цэнтр. Выканкам дапамог ёй у вырашэнні праблем, з якімі забудоўшчык абавязкова сустрэнецца пры атрыманні зямельнага ўчастка ў такім раёне і пры зносе старога жыллёвага фонду, без чаго не абысціся. Нас падтрымалі ў аблвыканкаме, і сёння будоўля ідзе поўным ходам. А гаспадары знесеных прыватных дамоў атрымалі новыя добраўпарадкаваныя кватэры, пабудаваныя на сродкі інвестара. І гэта прыклад пазітыўнай работы ўлады і пазітыўнай работы прадпрымальнікаў.

Можна назваць іншыя адрасы не проста выжывання, а ўстойлівай працы тых ці іншых калектываў горада з улікам перспектывы. Нармальна, у асноўным стабільна працуе 558-ы авіяцыйны завод.

Як бы ні было складана, нават цяжка, але знайшоў свае аб'ёмы і робіць усё магчымае для іх выканання завод аўтаматычных ліній. Не ўсё там да канца добра, існуе пэўнае напружанне з бюджэтам, да таго ж праблемныя расійскія заказчыкі, але тым не менш.

— Калі перайначыць вядомую фразу «Улада для народа ці народ для ўлады?», то — выканкам для прадпрыемстваў, ці наадварот?

— Я не думаю, што прадпрыемствы для выканкама, хутчэй выканкам для рэальнага сектара. А ўсе разам мы працуем для народа. Мы разумеем іх патрэбы і ідзём насустрач, дапамагаем вырашаць.

Нельга забываць і пра тое, што велізарнае месца ў дзейнасці мясцовай улады, органаў кіравання займае сацыяльная сфера. Яна фінансуецца за кошт падаткаў, за кошт збораў, найважнейшая крыніца якіх — рэальны сектар. Гэтым таксама тлумачыцца наша пільная ўвага і наша яму пастаянная падтрымка і дапамога.

— З чым вы звязваеце перспектывы горада?

— З развіццём сяродняга і малога бізнэсу. Званне «мэблевай сталіцы» мы заслужылі за кошт прыватнага бізнэсу. Сёння на той жа «Лагуне» працуе ні многа, ні мала — тысяча чалавек. Іх аб'ёмы выпушчанай прадукцыі пачынаюць ціснуць на рынак. Прычым, прадукцыя больш танная пры высокім узроўні якасных паказчыкаў.

У нас ёсць і магчымасці для развіцця турызму — плануем прывесці ў належны стан некалькі цікавых аб'ектаў, звязаных з гісторыяй і ходам 1-й сусветнай вайны. У прыватнасці, у Баранавічах знаходзіўся штаб стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, і цар Мікалай II дзесяць разоў быў у горадзе і кіраваў адсюль ваеннымі дзеяннямі. Плануем рэканструкцыю дома, дзе размяшчалася стаўка, і адкрыццё ў ім музея. Збіраемся таксама рэстаўраваць фартыфікацыйныя збудаванні тых часоў і добраўпарадкаваць іх як аб'ект турызму. І шмат што іншае. Ёсць унікальны музей чыгункі, які трэба больш эфектыўна выкарыстоўваць. Захаваць тое, што ёсць, і будаваць новае — вось нашы падыходы: у эканоміцы, сацыяльным жыцці, культуры.

«ЁСЦЬ ВІДЫ ПРАДУКЦЫІ, ЯКІЯ ПАСТАЎЛЯЕМ ТОЛЬКІ МЫ...»

Наступны адрас нашага журналісцкага «дэсанта» — адно з вядучых прадпрыемстваў будаўнічай індустрыі краіны: Баранавіцкі камбінат жалезабетонных канструкцый.

Вынікі працы гэтага калектыву — навідавоку. З унікальных канструкцый Баранавіцкага КЖБК узведзены знакамітая Камароўка, чыгуначны вакзал-прыгажун «Мінск-Пасажырскі», Палац Рэспублікі на Кастрычніцкай плошчы, футбольны манеж на праспекце Пераможцаў сталіцы, комплекс «Мінск-Арэна»... А яшчэ летні амфітэатр у Віцебску, дзе праходзіць фестываль «Славянскі базар», вясляны канал у Брэсце, завод газетнай паперы ў Шклове — пералік можа атрымацца доўгім і прыгожым. Камбінату ў свой час было прысвоена званне ўзорна-паказальнага прадпрыемства Мінпрамбуда СССР, і гэтае пачэснае званне калектыў з годнасцю нясе і сёння, у няпростых рэаліях новага стагоддзя.

На ўчастку, дзе вырабляюць апоры высакавольтных ліній.

Расказвае дырэктар Юрый Анатольевіч ГРАМАКОЎСКІ, на сцяне службовага кабінета якога — дыплом «Чалавека года», ганаровыя граматы ўрада і галіновага міністэрства, прысуджаныя калектыву і яму асабіста. І нават падзячнае пісьмо ад Паўла Барадзіна за ўклад у інтэграцыйныя працэсы.

— Калектыў наш не маленькі — больш за 600 чалавек. Таму сёння стаіць задача забяспечыць людзей працай, планамерна загрузіць вытворчасць. Прадпрыемству 41 год, стваралася яшчэ ў савецкія часы, з вузкай спецыялізацыяй — выпускала пліты адной і той жа наменклатуры, па 70 штук за змену. Зараз рынак патрабуе зусім іншага. У сённяшняй сітуацыі асноўная задача зводзіцца да задавальнення попыту на будаўнічыя канструкцыі шырокага асартыменту як унутры рэспублікі, так і за яе межамі. Інавацыйная палітыка прадпрыемства, а таксама антыкрызісная праграма, якая была распрацавана на аснове рэкамендацый Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва і накіравана на дыверсіфікацыю вытворчасці і павышэнне якасці выпускаемай прадукцыі, дазваляюць калектыву спраўляцца з тымі паказчыкамі сацыяльна-эканамічнага развіцця, якія яму даводзяцца. За 9 месяцаў выкананы і перавыкананы ўсе даведзеныя заданні, за выключэннем матэрыялаёмістасці. Паказчык для нас дастаткова складаны, сёння з яго выкананнем ёсць праблемы ва ўсіх айчынных прадпрыемстваў зборнага жалезабетону.

Дырэктар прадпрыемства Юрый ГРАМАКОЎСКІ.

За дзевяць месяцаў рост вытворчасці ў супастаўных цэнах складае 108,7 працэнта. Мы змаглі ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі з боку расійскіх вытворцаў не згубіць рынак Расійскай Федэрацыі, хоць там і назіраецца адчувальнае зніжэнне будаўнічай актыўнасці, і яны бяруць менш. А таксама пачаць пастаўку ў Латвію. Крызіс зачапіў нашых суседзяў адчувальна, у тым жа Калінінградзе стаяць гатовыя кватэры і не прадаюцца. Тым не менш трапляем на рынкі Санкт-Пецярбурга, Масквы, Пскова, Смаленска, Бранска, Мурманска, іншых рэгіёнаў Расіі.

Адным словам, рэалізацыя прадукцыі за паўгоддзе павялічылася, адпаведна ўзраслі плацяжы ў бюджэт.

Калі азірнуцца назад, то ў самым пачатку года сітуацыя была вельмі складаная, як і ва ўсёй эканоміцы. За першы квартал, каб не спыніць работу прадпрыемства, нам давялося давесці запасы на складах да ўзроўню 83 працэнтаў сярэднямесячнага ўзроўню вытворчасці. Расія цалкам «маўчала», прадукцыю не брала. У Беларусі палачкай-выручалачкай стала дзяржаўная праграма «Жыллё». Буйныя будоўлі не вяліся. Менеджменту жылося складана. Нашы маркетолагі і збытавікі занялі больш агрэсіўную, калі можна так сказаць, пазіцыю, самі настойліва выходзілі на пастаянных і патэнцыйных кліентаў, дамаўляліся аб рэалізацыі. Шукалі і праз інтэрнэт, размяшчалі ў «сусветным павуцінні» свае прапановы, асабліва на расійскіх, украінскіх, прыбалтыйскіх сайтах. Гарантавалі хуткую пастаўку якаснай прадукцыі па выгаднай цане. Стараліся ўдзельнічаць ў выставах, і калі ехалі, напрыклад, у Калінінград ці Піцер, загадзя паведамлялі сваім партнёрам і запрашалі прыйсці на сустрэчу. А калі не маглі паехаць, усё адно ўдзельнічалі завочна — праз бюлетэнь і газеты, што распаўсюджваліся сярод удзельнікаў.

Гэта былі цяжкія дні, месяцы, нават кварталы. Ні для каго не сакрэт, што ў той час мы выжылі толькі дзякуючы падтрымцы кіраўніцтва краіны — будаўнічая галіна атрымала аб'ёмы работ па ўзвядзенні жылля, і мы ўсім калектывам без выхадных дзён працавалі на выпуску пліт пустотнага насцілу для жылых дамоў.

Гатовыя пліты пустотнага насцілу пакідаюць цэх.

Прадукцыя больш-менш «пайшла» толькі ў чэрвені. Але так ці інакш, за першае паўгоддзе мы адчувальна знізілі складскія запасы, а за дзевяць месяцаў выйшлі на ўзровень міністэрскага задання. Зараз прадукцыю выпускаем у лічваем, што тыя крокі, якія мы рабілі, дазволяць завяршыць год з нармальнымі паказчыкамі, у тым ліку па экспарце прадукцыі.

Такім чынам мы не толькі выжылі, а нават атрымалі прыбытак, якога павінна хапіць на абнаўленне і інвестыцыі, і змаглі даць людзям нармальную зарплату. За дзевяць месяцаў сярэдні заробак склаў адзін мільён дзвесце пяцьдзесят тысяч рублёў.



Лабарант Анжэла БУРСЕВІЧ рыхтуе ўзоры бетону да выпрабаванняў.

Інжынер-тэхнолаг Аляксандр ДЗЯРУЖКА.

Нават у сённяшніх умовах шмат што робім для абнаўлення вытворчасці. Дастаткова сказаць, што толькі за мінулы год на інвестыцыі ў асноўны капітал, на абнаўленне актыўнай часткі асноўных фондаў, пайшло больш за пяць мільярдаў рублёў. Калі прывесці дынаміку зніжэння зносу актыўнай часткі асноўных вытворчых фондаў, то тры гады таму знос складаў больш за 90 працэнтаў, а сёння ён на ўзроўні 68 працэнтаў. Такое вось адбылося абнаўленне.

Па выніках дзевяці месяцаў таксама выканана заданне па энергазберажэнні, нягледзячы на тое, што ў першым паўгоддзі былі праблемы.

Калі ўжо загаварылі пра інвестыцыі, то сёлета мы павінны завяршыць мадэрнізацыю бетоназмешвальнага цэха, што дазволіць адчувальна павялічыць выдачу бетоннай сумесі ў фармовачныя пралёты. А гэта будзе нядрэнная база росту аб'ёмаў выпушчанай прадукцыі на наступныя гады. У найбліжэйшых планах і мадэрнізацыя ўчастка па выпуску таварнага бетону, бо больш хуткімі тэмпамі пачне развівацца маналітнае будаўніцтва. Зараз у Баранавічах два дамы «прывязваюцца» ў каркасным выкананні, будзем цалкам камплектаваць іх. Акрамя таго, мы не супраць паўдзельнічаць ва ўзвядзенні горада беларускіх атамных энергетыкаў.

Маем вопыт камплектных паставак канструкцый на найважнейшыя будоўлі і жадаем пазіцыянаваць сябе як прадпрыемства з вычарпальнай наменклатурай вырабаў: ад поўнага набору палевых фундаментаў, калон, рыгеляў, пліт пустотнага насцілу і пліт пакрыццяў рабрыстых даўжынёй ад 2 да 12 м пад любыя нагрузкі, ад таварных бетонаў — да стоек апор высакавольтных ліній электраперадач для аграгарадкоў. Бо зразумела, што чым больш поўны пералік прадукцыі, якая выпускаецца, тым большая ўстойлівасць у сённяшняй сітуацыі. Што і паказаў гэты год. Я казаў, што яго першую палову мы пражылі на пустотных плітах. А цяпер гэта прадукцыя менш запатрабаваная, таму пераключыліся на экспартаарыентаваную, і сёння асноўная валютная выручка менавіта на ёй. Калі гаварыць абагулена, то інвестыцыі накіроўваем на далейшую дыверсіфікацыю нашай прадукцыі і павелічэнне аб'ёмаў тых яе новых відаў, якія зараз карыстаюцца попытам.

Скажу адно: ёсць такія віды прадукцыі, якія пастаўляем толькі мы. У тым ліку па індывідуальных, не тыпавых праектах. Можам выканаць любы капрыз архітэктара, праекціроўшчыка. Ёсць сваё падраздзяленне па вырабе аснасткі, і там робім усё.

Што да аб'ёмаў, то яны растуць — перш за ўсё за кошт жыллёвага будаўніцтва. Сёння камбінат дае ў месяц больш за 12 тысяч кубічных метраў зборнага жалезабетону.

Куды ідзе прадукцыя? У Кобрыне, дзе сёлета святкавалі дажынкі, ішла на лядовы палац, на аквапарк, на рэканструкцыю філіяла «Беларусбанка» і Палаца культуры. Цяпер у абласным цэнтры ўзводзіцца Палац водных відаў спорту. Наогул, найважнейшыя новабудоўлі Брэстчыны не абыходзяцца без нашай прадукцыі. У самім Брэсце гэта і Палац гульнявых відаў спорту «Вікторыя» з яе арыгінальнай архітэктурай, і лядовы палац, і лёгкаатлетычны манеж, і Палац спорту. Аб'екты ў Пружанах, Пінску, нават у Белавежскай пушчы, што не менш ганарова, чым удзел, які мы прымалі ва ўзвядзенні «Мінск-Арэны».

Адпраўляем прадукцыю па ўсёй рэспубліцы. У нас камплектуюцца Гродна і Гомель, Магілёў і Віцебск, хоць у іх ёсць свае такія ж заводы.

З лета 2007 года ў нас працуе сістэма менеджменту якасці. Распрацоўвалі яе пры дапамозе Баранавіцкага занальнага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі. Там кваліфікаваныя, нераўнадушныя спецыялісты. Укараненне, як і паўсюдна, ішло няпроста, затое «падцягнулі тылы», адладзілі ўзаемаадносіны паміж падраздзяленнямі, адшліфавалі тэхналогіі. Усю работу па якасці паставілі на сур'ёзную метадалагічную і дакументальную аснову. За функцыянаваннем сістэмы сочыць тэхналагічны аддзел.

Прадукцыю сваю сертыфікуем. Ёсць сертыфікаты на пустотныя пліты для ўзвядзення жылля, на рабрыстыя пліты, якія ідуць на стадыёны, школы і г.д. І яшчэ на некаторыя віды прадукцыі з ліку асноўных. Мы інтэнсіўна займаемся атрыманнем адпаведных сертыфікатаў для таго, каб замацавацца на расійскім рынку, а ў будучым выйсці і на еўрапейскі. Але справа, як высветлілася, далёка не простая, і спатрэбіцца пэўны час. Тым не менш гэта — рэальная перспектыва.

УНП 200166740

(Працяг тэмы на стар. 5.)

Электразваршчык Генадзь ЯДЫНКА.



Кіпіць работа ў цэхах.

НАТАЛІЦЬ СМАГУ ГОРАДУ

Дырэктар камунальнага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Водаканал» Віктар КАЛАСОЎСКІ: «Ганарымся людзьмі і тэхналогіямі!»

(Працяг тэмы. Пачатак на стар. 4).

1

— Чаму ганарымся людзьмі — зразумела, гэта наша самае галоўнае багацце: зладжаны калектыў падрыхтаваных, нават вышкаленых, у станоўчым сэнсе слова, спецыялістаў, які мае багатую 50-гадовую гісторыю і адказна і нават творча выконвае сваю Задачу (менавіта так, з вялікай літары).

Што датычыцца тэхналогій, — працягвае Віктар Вікенцьевіч, — то на прадпрыемстве прымяняюцца найноўшыя сусветныя тэхналогіі ачысткі і абеззараджвання пітной вады, якія выкарыстаны ў Беларусі ўпершыню. Тэхналогій, якімі мы карыстаемся штодзённа, няма больш ні ў кога ў краіне.

Можна сказаць, што чыста прафесійна ганарымся таксама сваімі вытворчымі магутнасцямі. Коратка патлумачу: уся вада, што падаецца ў горад, — толькі з падземных крыніц глыбінёй 180—280 метраў. Каб падняць яе, маюцца 74 артэзіянскія свідравіны. Падрыхтоўка вады пітной якасці выконваецца пад жорсткім кантролем хіміка-бактэрыялагічнай лабараторыі на трох водазаборах — «Волахва», «Шчара-1» і «Шчара-2» з іх станцыямі абезжалезвання. Найбольш якасную і самую танную ў параўнанні з іншымі аналагічнымі збудаваннямі Беларусі дае цяпер водазабор «Волахва», што знаходзіцца ў цэнтры горада, максімальна набліжана да спажыўца.

Тэхнічны прагрэс у нашай галіне крочыць даволі імкліва. Вось чаму, мадэрнізуючы сістэмы водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі, мы пастаянна і сур'ёзна займаемся тэхнічным пераўзбраеннем, рэканструкцыяй вытворчых аб'ектаў. Пасля нядаўняй рэканструкцыі водазабора «Волахва» яго магутнасці істотна павялічыліся — з 16 да 24 тысяч кубічных метраў у суткі, тэхналагічным працэсам кіруе аўтаматыка, аптымізавана колькасць абслуговага персаналу. Менавіта тут упершыню ў краіне прыменены найноўшыя тэхналогіі ачысткі і абеззараження, пра якія я казаў. Прычым без «дапамогі» вадкага хлору. Рэканструкцыя абышлася ў 2,3 мільярда рублёў.

Мы дабіліся тут еўрапейскіх паказчыкаў ачысткі вады ад жалеза — 0,1 мг на літр. У сувязі з гэтым істотна — на 37 працэнтаў зменшыліся звароты грамадзян са скаргамі на якасць вады.

Яшчэ ў 2001 годзе была сертыфікавана водаправодная вада для піцця, якая падаецца спажыўцам. На той час баранавіцкі «Водаканал» быў адзіным у рэспубліцы, хто меў сертыфікат адпаведнасці на пітную ваду з размеркавальнай сеткі ўсіх трох водазабораў. Не хачу пакрыўдзіць нікога з калег, але і цяпер далёка не ўсе водаканалы краіны змаглі выйсці на такі ўзровень ачысткі вады. Пакуль гэтую праблему вырашаюць і сталічныя камунальнікі.

Штогод мы пацвярджаем правамоцнасць свайго сертыфіката.

Сучасныя тэхналогіі дапамаглі нам першымі сярод прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі наладзіць выпуск бутляванай крэмніевай вады «Веда». Для яе вытворчасці выкарыстоўваецца артэзіянская вада водазабора «Шчара-2», якая залягае на глыбіні 260—300 метраў і ўтрымлівае аптымальны прыродны набор соляў і мікраэлементаў. Выпускаем яе ў ПЭТ-бутэльках рознай ёмістасцю (0,33; 0,5; 1,5 і 5 літраў) і ў 19-літровых шматабаротных бутлях. Пастаўляем не толькі прадпрыемствам гандлю, але і спажыўцам на кватэры і ў офісы — па іх заяўках, за наяўны разлік. Летась наша бутляваная вадзіца з крэмніевай ачысткай атрымала сертыфікат адпаведнасці міжнароднаму стандарту ISO 9001-2001.

Да слова сказаць, цэх па выпуску «крэмнёўкі» быў пабудаваны ўласнымі сіламі. Сёння задумваемся над магчымасцямі яе больш шырокай рэалізацыі. Калі б не транспартныя расходы, якія з'ядуць усю выручку, можна было пастаўляць у Расію. А пакуль у нас амаль паўтысячы спажыўцоў на ўнутраным рынку (дзейнічаюць 432 дагаворы з прадпрыемствамі). І пасля выхаду на праектную магутнасць (4,7 мільёна літраў у год) будзем выпускаць 6 працэнтаў вады, узбагачанай крэмніем, у агульным аб'ёме ўсяго беларускага рынку пітных водаў, а гэта не мала. Адным словам, у нашым калектыве стаўленне да якасці вады — крыніцы жыцця на Зямлі — больш чым паважлівае.

— Вам даводзіцца вырашаць «двухадзіную» задачу — развіваць водазабеспячэнне горада далей і адначасова зніжаць спажыванне вады...

— Узровень ахопу цэнтралізаваным водазабеспячэннем у горадзе з насельніцтвам 180 тысяч жыхароў высокі — больш за 90 працэнтаў, а вось з каналізацыяй сур'ёзна адстаём, ахоплена толькі 75 працэнтаў. Праўда, тут ёсць зрухі — цяпер ідзе развіццё сеткі, будуемся ў раёне «Аэрапорт», і пасля ўводу новых магутнасцяў дабавіцца адразу тысяча спажыўцоў.

Існуе і праблема старэння інжынерных сетак.

А што датычыцца эканоміі, то па выніках работы за мінулы год аб'ём рэалізацыі вады ўсім групам спажыўцоў склаў 10,3 млн м куб. За пяць апошніх гадоў (пачынаючы з 2003-га) названы аб'ём зменшыўся на 33 працэнты. А за 9 месяцаў гэтага года аб'ём рэалізацыі вады зменшыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года яшчэ на 9 працэнтаў.

Безумоўна, вялікую ролю ў гэтым адыграла ўстаноўка прыбораў уліку вады. Жыхары горада атрымалі магчымасць разлічвацца не за нарматыўнае водаспажыванне, а за тую колькасць жыватворнай вільгаці, якая фактычна расходавана ў іх кватэрах. Можна гаварыць пра тое, што мае месца больш рацыянальнае выкарыстанне яе насельніцтвам. Бо пры зацверджанай норме водакарыстання ў 280 літраў у суткі на чалавека фактычна расходуецца 153 літры. Калі ўлічыць, што больш за 98 працэнтаў усіх кватэр і дамоў з цэнтралізаваным водазабеспячэннем абсталяваны індывідуальнымі прыборамі ўліку вады, то ў Баранавічах ёсць магчымасць стаць горадам рацыянальнага водакарыстання, і водаспажыванне ў горадзе павінна ўстойліва замацавацца нават ніжэй за еўрапейскі ўзровень — 180—200 літраў на аднаго чалавека.

2

Праўда, калі быць шчырым, то павінен сказаць, што нам гэта... не зусім выгадна, як ні парадаксальна гучыць. Бо калі аб'ёмы зніжаюцца, то скарачаюцца і нашы даходы — прычым на сотні мільёнаў рублёў. Тым не менш зыходзім з інтарэсаў горада і будзем завяршаць усталяванне лічыльнікаў, а даходы павялічваць за кошт тэхнічнага прагрэсу і нявыкарыстаных рэзерваў. А яны ёсць. Сёння на балансе ў нас, як я ўжо адзначаў, 74 свідравіны, з іх працуе каля 30, астатнія ў рэзерве, што само па сабе стварае праблему «замарожвання» асноўных фондаў. Чаму столькі свідравін трапілі ў рэзерв? Знізілася, як мы ўжо гаварылі, водакарыстанне, а на дзейныя свідравіны ўстанавілі больш прадукцыйнае абсталяванне, і яны прынялі на сябе большы «фронт» работ.

Яшчэ адна даволі складаная праблема заключаецца ў тым, што ў нас сёння тры водазаборы, яны ўвязаны ў адну сістэму, з улікам чаго працуе ўся гідраўліка. Сёння пасля рэканструкцыі «Волахвы» нам хапае двух водазабораў. І ўжо на працягу года днём, калі існуе мінімальны разбор, адзін водазабор спыняем. Узнікае пытанне, што з ім рабіць надалей: іншыя такія вось «міні-расходы» складваюцца ў кубаметры вады. Скажам, за ноч можа «накапаць» цэлая ванна.

— Цалкам выконваючы сацыяльныя стандарты па забеспячэнні насельніцтва вадой, вы аказваеце яму і арганізацыям дадатковыя паслугі. Што гэта за паслугі?

— Прадпрыемства пастаянна нарошчвае пералік відаў сваёй дзейнасці. Маем ліцэнзіі больш чым на 30 відаў работ. Укараненне новых відаў дзейнасці дазволіла дадаткова стварыць больш за 100 працоўных месцаў і заняць людзей, якія выслабанены ў сувязі з аўтаматызацыяй асноўнай вытворчасці і зніжэннем яе аб'ёмаў. А нарошчванне аб'ёмаў дадатковых платных паслуг насельніцтву дапамагае пэўным чынам вярнуць тое, што мы страцілі на зніжэнні аб'ёмаў водакарыстання. За дзевяць месяцаў года зрабілі дадатковых паслуг насельніцтву больш чым на 700 мільёнаў рублёў, юрыдычным асобам — больш чым на мільярд. Так што справа гэта ўзаемакарысная.

На працягу шэрагу гадоў мы з'яўляемся адной з эксперыментальных пляцовак рэспублікі, на якіх вялася адпрацоўка прынцыпаў работы са спажыўцамі ў рэжыме «аднаго акна», і цяпер ажыццяўляем поўны комплекс паслуг па гэтым прынцыпе. На прадпрыемстве створаны скразны цыкл работ з клієнтам — ад яго першага звароту па пытаннях падрыхтоўкі тэхнічных умоў на далучэнне да водаправоду ці каналізацыі да заключэння дагавора. Укараненне гэтай сістэмы дазволіла значна скараціць дакументаабарот і зменшыць тэрмін падрыхтоўкі розных дакументаў для кліентаў.

Для прыцягнення дадатковых даходаў на вытворчай базе створаны спецыялізаваны сэрвісны цэнтр па гарантыйным і паслягарантыйным абслугоўванні і рамонце помпавага абсталявання вытворчасці вядучых замежных фірмаў.

А ў адміністрацыйна-бытавым будынку прадпрыемства працуе фірменная крама, у якой гараджане могуць купіць неабходныя матэрыялы і запчасткі для рамонту і будаўніцтва сетак водазабеспячэння і водаадвядзення, сантэхнічнае абсталяванне, лічыльнікі вады, фільтры ачысткі вады і г.д. У цэнтры горада адчынілі яшчэ адну фірменную краму «Веда».

— Прадпрыемства «Водаканал» уваходзіць у тройку самых буйных спажыўцоў электраэнергіі ў горадзе...

— Штомесяц мы плацім толькі за электраэнергію касмічную суму — 180 тысяч долараў ЗША. Але прыемна адзначыць, што за апошні час гадавое яе спажыванне зніжана настолькі адчувальна, што на зэканомленай электраэнергіі можам працаваць 45 дзён у год. Дарэчы, рэканструкцыю водазабора «Волахва» правялі ў значнай ступені для зніжэння

3

4

5

6

сабекошту прадукцыі за кошт змяншэння затрат электраэнергіі (у структуры сабекошту затраты на яе займаюць 37 працэнтаў). Прадпрыемства неаднойчы выходзіла пераможцам гарадскога агляду-конкурсу па энергазберажэнні.

Адным з перспектыўных кірункаў у галіне энергазберажэння з'яўляецца выкарыстанне цяпла сцёкавых водаў для абагрэву будынкаў і збудаванняў. На ачышчальных збудаваннях укаранёна рэкуперацыйная ўстаноўка па выпрацоўцы цеплаэнергіі, што дазваляе бясплатна абаграваць увесь комплекс ачышчальных збудаванняў, ва ўсякім разе, пакуль на двары трымаецца тэмпература да мінус 12 градусаў.

А выкарыстанне ў недалёкай будучыні біягазу для вытворчасці электраэнергіі і цяпла дазволіць забяспечыць яшчэ большую энергетычную бяспеку гарадскіх ачышчальных збудаванняў і станоўча адаб'ецца на экалогіі рэгіёна.

— Што ў дырэктара ў планах?

— Мы адзін раз і назаўсёды выбралі для сябе інавацыйны шлях развіцця. Таму ў планах, як мінімум, далейшае прыцягненне сучасных тэхналогій. У тым ліку больш шырокае ўкараненне бестраншэйных метадаў рэканструкцыі трубаправодаў, замена металічных труб на пластмасавыя, што выключае небяспеку другаснага забруджвання вады, і шмат чаго іншага, не менш карыснага і эфектыўнага. У планах — рэканструкцыя водазабора «Шчара-2», на што спатрэбіцца 1,1 млн долараў ЗША (вядзецца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі). А таксама будаўніцтва цэха механічнай апрацоўкі асадку на ачышчальных збудаваннях каналізацыі — яшчэ 3 млн долараў ЗША. Дарэчы, работы па рэканструкцыі гарадскіх ачышчальных збудаванняў з комплекснай аўтаматызацыяй тэхналагічнага працэсу ўжо вядуцца, частку задач па павышэнні эфектыўнасці механічнай і біялагічнай ачысткі ўдалося вырашыць. Канчатковая мэта — удасканальваючы якасць водападрыхтоўкі, дасягнуць больш высокіх паказчыкаў па глыбокай ачыстцы сцёкавых водаў. Для гэтага патрабуюцца найноўшыя метады і даследаванні, і тут мы працуем разам з навукоўцамі БНТУ.

Зусім нядаўна, калі мы гаварылі пра інвестыцыі ў свой асноўны капітал, то ахвотна прыводзілі такую «прыгожую» лічбу: у параўнанні з недалёкім 2003 годам аб'ём інвестыцый на нашым прадпрыемстве дзякуючы дапамозе дзяржавы, уважэ мясцовых уладаў да нашых праблем і ўласнай разваротлівасці, скажам так, узрос больш чым на... 580 працэнтаў. І гэта чыстая праўда. Эканамічны крызіс у свеце прымушае нас, што называецца, часова «ўмерыць апетыты». Але крызісы з некаторай перыядычнасцю прыходзяць і сыходзяць, а жаданне калектыву працаваць традыцыйна высокаэфектыўна застаецца.

УНП 200566186.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Тым, хто звяртаўся ў «Водаканал» па тэлефоне, знаёмы добразычлівы голас аператара Алены ЗЯЛЕНЧЫК.

2. Дырэктар прадпрыемства Віктар КАЛАСОЎСКІ.

3. Праца водаправодчыка стала тэмай для скульптуры, а старажытны вазок вадавоза — своеасаблівым музейным экспанатам на зялёным газоне побач з будынкам «Водаканала».

4. — Абагачаная крэмніем вада з артэзіянскіх глыбінь сабрала неблагі ўраджай медалёў, — гаворыць прадавец фірменнай крамы Алена АЛЯКСЕЙЧЫК.

5. Начальнік аварыйна-дыспетчарскай службы Антаніна НЕЗАМУДЗІНАВА і начальнік тэхнічнага аддзела Васіль КАЗІМІРЧЫК.

6. Панарама гарадскіх ачышчальных збудаванняў.

7. У машыннай зале водазабора «Волахва».

8. Рэнавацыя сетак водаправода ў мікрараёне «Паўночны».

7

8

У ПРАЦОЎНЫМ РЫТМЕ КРАІНЫ

Мы пабывалі ў лакаматыўным дэпо Баранавічы транспартнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Баранавіцкае аддзяленне Беларускай чыгункі».

Калі па тэрыторыі Беларусі была пракладзена чыгунка Масква—Смаленск—Мінск—Баранавічы—Брэст, а гэта адбылося ў 1871 годзе, то для абслугоўвання паравозаў пачалі будаваць паравозныя майстэрні, якія затым перараслі ў дэпо. Напачатку гэта быў «... адзін паравозны будынак на два паравозы...». Менавіта такая характарыстыка дадзена ў «Журнале агляду чыгункі» ад 1 лістапада 1871 года. З гэтай даты і пачынаецца гісторыя лакаматыўнага дэпо Баранавічы, якое сёння стала самым буйным, шматпрофільным, высокамеханізаваным рамонтна-эксплуатацыйным прадпрыемствам Беларускай чыгункі. У вытворчай структуры дэпо — цэхі па рамонце электрацягнікоў, электравозаў і дызель-цягнікоў, цэх эксплуатацыі. І трыццаць шэсць участкаў, аддзелаў (калёсны, электрамашынны, электраапаратны, зварачны, аўтаматны і інш.), якія ўваходзяць у вытворчую структуру цэхаў і аснашчаны самым сучасным абсталяваннем. Калектыў лакаматыўнага дэпо, а гэта 2184 чалавекі, складаецца з высокакваліфікаваных спецыялістаў, яны прафесійна выконваюць свае абавязкі, забяспечваюць зладжаны рытм перавозак.

2

ГАРАНТЫЯ ЯКАСЦІ І БЯСПЕКІ

А якая сітуацыя на прадпрыемстве сёння, калі наўкол столькі нараканняў на крызіс, эканамічную нестабільнасць?

— Крызіс закрануў і нас, бо мы таксама залежым ад агульнай эканамічнай сітуацыі, — сказаў начальнік лакаматыўнага дэпо Уладзімір НІКАНОВІЧ, — але падстаў для вялікага песімізму ў нас няма. Сёлета не было заказаў з Расіі і нам прыйшлося паварушыцца. У нас ужо ёсць дагаворы з прадпрыемствамі Прыбалтыкі, хоць раней іх не было.

1

— Уладзімір Канстанцінавіч, на многіх прадпрыемствах калектывы перайшлі на няпоўны працоўны дзень ці ўвогуле ідзе скарачэнне. А ў вас як у гэтым плане?

— Дваццаць чалавек мы перавялі з цэхаў у будаўнічую групу. І гэта мізар для калектыву, які налічвае больш за дзве тысячы чалавек. Прадпрыемства сваімі сіламі вядзе рамонт будынкаў, участкаў ды і аб'ём работ павялічыўся. Сёння сярэдняя зарплата па лакаматыўным дэпо прыкладна 1 млн 400 тыс. рублёў. І ў параўнанні з 2008 годам яна выраслa сёлета на 123,6 %. А гэта пра многае гаворыць...

Нягледзячы на тое, што лакаматыўнае дэпо найперш рамантуе рухомы састаў сваёй краіны, тым не менеў прадпрыемства вытрымлівае канкурэнцыю і на міжнародным рынку. Кваліфікаваны персанал, сучаснае абсталяванне, развітая сістэма менеджменту дапамагаюць асвойваць новыя ўнутраныя і знешнія рынкі збыту сваёй прадукцыі і паслуг.

Асноўнымі заказчыкамі дэпо з'яўляюцца Беларуская чыгунка, «Беларуськалій», «Гродна-Азот», іншыя флагманы індустрыі, а на міжнародным узроўні дэпо супрацоўнічае з прадпрыемствамі Латвіі і Расійскай Федэрацыі.

На прадпрыемстве ёсць усё, каб рамонт быў самай высокай якасці, і калі на тэрыторыі дэпо вісіць лозунг, на якім напісана, што якасць гарантуецца, то, відавочна, гэта так. Напрыклад, найбольш адказныя вузлы і дэталі цягавага рухомага саставу ў працэсе рамонту выпрабоўваюцца ўльтрагукавой, магнітнай, каляровай дэфектаскапіяй з выкарыстаннем сучасных шматпрофільных дэфектаскопаў.

Калі заказчык пажадае, то лакаматыўнае дэпо Баранавічы ў працэсе рамонту можа выпускаць вагоны электрацягнікоў павышанай камфартабельнасці: з барам, кандыцыянерам, зручнымі крэсламі... Сучасныя матэрыялы дазваляюць зрабіць салон вельмі прывабным, а канструкцыйныя элементы больш надзейнымі.

На тэрыторыі Беларусі лакаматыўнае дэпо Баранавічы — адзінае прадпрыемства, якое асвоіла капітальны рамонт электрацягнікоў і электравозаў. І цяпер Беларуская чыгунка не рамантуе іх за межамі краіны, а гэта дало магчымасць зэканоміць у год некалькі мільёнаў долараў ЗША.

А цэх эксплуатацыі дэпо выконвае грузапасажырскія перавозкі на ўчастках: Баранавічы—Мінск, Баранавічы—Гродна, Баранавічы—Ліда, Баранавічы—Слуцк і Баранавічы—Лунінец, а грузавыя перавозкі яшчэ і на ўчастках Баранавічы—Брэст, Баранавічы—Орша, Баранавічы—Ваўкавыск.

Для навучання лакаматыўных брыгад, павышэння кваліфікацыі і правядзення тэхнічных заняткаў сіламі работнікаў цэха эксплуатацыі створаны адзін з лепшых трэнажораў на Беларускай чыгунцы.

Цікава, што вынікі паездак аналізуюцца тэхнікамі-расшыфроўшчыкамі па распрацаванай камп'ютарнай праграме.

У дэпо зроблены націск на псіхафізіялагічнае забеспячэнне прафесійнай дзейнасці работнікаў цэха, а гэта ўключае ў сябе: псіхафізіялагічны адбор, перыядычнае прафесійнае абследаванне, псіхалагічныя кансультацыі... У дэпо ёсць псіхолаг, які і ажыццяўляе гэтыя мерапрыемствы. А ў доме адпачынку лакаматыўных брыгад абсталяваны пакой псіхалагічнай разгрузкі.

4

У дэпо створаны і добрыя ўмовы для працы і адпачынку. Сучасная сталоўка, кафетэрый, бібліятэка, здраўпункт, кабінет фізіяпрацэдур, база адпачынку на возеры Гаць... Як і музей дэпо, што адчыніў свае дзверы сёлета, усё гэта сведчыць пра ўвагу, якую кіраўніцтва прадпрыемства ўдзяляе свайму калектыву.

А ў калектыве пакрысе адбываецца змена пакаленняў.

— У нас працуе 64 чалавекі, і ўсе яны маладыя — 30—35 гадоў, — кажа майстар электраапаратнага ўчастка Віталь Самкевіч, — а значыць, энергічныя і дзелавыя.

Пабываўшы ў цэхах лакаматыўнага дэпо, міжволі звяртаеш увагу на гэты факт — наўкол маладыя людзі. А калі так, то на прадпрыемстве ўсё нармальна — ёсць перспектыва.

3

НА ЗДЫМКАХ:

1. Начальнік лакаматыўнага дэпо Уладзімір НІКАНОВІЧ.

2. Алег СЛЕПКАРОЎ — машыніст-інструктар.

3. Слесар-электрык электраапаратнага ўчастка Сяргей ЦІХОНКА.

4. Абмотчыца Алена РЫХЛІЦКАЯ, маляр Галіна САЎКІНА і дэфектаскапіст Святлана ЛАПКОЎСКАЯ працуюць на электрамашынным участку.

(Заканчэнне тэмы на стар. 6).

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4, 5).

ЯКАСЦЬ – ГЭТА АПРАЎДАННЕ ЧАКАННЯЎ СПАЖЫЎЦА

Гутарка з дырэктарам Баранавіцкага Цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Мікалаем Мікалаевічам ЛАБКО

— На слыху эканамічны крызіс, фінансавая нестабільнасць... А я недзе вычытаў такую фразу: калі ў хворага высокая тэмпература, то не варта бясконца шчоўкаць па тэрмометры, а трэба займацца лячэннем. Рэцэпт лячэння ад крызісу даўно агучыў кіраўнік краіны — размова ідзе пра канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі.

Калі гаварыць пра наш прафесійны падыход да гэтай задачы, то сёння стандартызацыя і ёсць той інструмент, які павінен дапамагчы вырашыць праблему канкурэнтаздольнасці. Прычым, паказчыкі стандартаў — ніжэйшая планка патрабаванняў да якасці і бяспечнасці прадукцыі і паслуг.

Калі хочаце, нашы падыходы знайшлі сваё адлюстраванне на выставе «Баранавіцкая восень 2009». Тут дэманструюцца лепшыя ўзоры прадукцыі і паслуг прадпрыемстваў, арганізацый і фірмаў горада.

— А яны, трэба думаць, у сваёй пераважнай большасці прайшлі працэдуру сертыфікацыі на адпаведнасць і міжнародным стандартам?

— Калі гаварыць пра сертыфікацыю прадукцыі, то ёю ахоплена прыкладна 80 працэнтаў наменклатуры вырабаў і паслуг. Працэс «пайшоў», і каб не стаяць на месцы, патрэбны новыя падыходы. Мы кажам кіраўнікам прадпрыемстваў: вы сертыфікавалі свой выраб, цудоўна. Але хацелася б ведаць, што гэта не выпадковы поспех, а заканамерны вынік сістэмнага падыходу да гэтай работы. Таму сёння мы ўжо вядзём размову пра сертыфікацыю сістэм кіравання якасцю, што існуюць на прадпрыемствах і павінны суадносіцца з міжнародным узроўнем патрабаванняў.

Выконваецца аналіз і даецца ацэнка вытворчасці, робяцца вывады аб эфектыўнасці дзейнай сістэмы кіравання якасцю. Яна павінна гарантаваць, што за вароты прадпрыемства няякасная прадукцыя выйсці не можа.

Вось у гэтым кірунку ў горадзе і праводзіцца велізарная работа. Вынікі якой у значнай ступені бачныя і вось тут, у экспазіцыях прадпрыемстваў на выставе.

Абсалютная большасць вядучых прамысловых прадпрыемстваў сертыфікавала свае сістэмы на адпаведнасць міжнародным патрабаванням ІСО 9000. Калі канкрэтна, то гэта 20 прадпрыемстваў. І радуе, што абсалютная большасць экспанентаў з'яўляецца ўладальнікам і адпаведнага сертыфіката, які яны пацвярджаюць згодна з найноўшымі версіямі ІСО.

На выставе «Баранавіцкая восень 2009» Мікалай ЛАБКО гутарыць з вядучым інжынерам завода станкапрыстасаванняў Таццянай ЖЫГАЛАВАЙ.

Перш за ўсё сертыфікуюць свае сістэмы тыя прадпрыемствы, якія арыентаваныя на экспарт сваёй прадукцыі. І гэта цалкам апраўдана. Калі ўспомніць нядаўні «малочны інцыдэнт», то расіяне нават не размаўлялі з тымі дырэктарамі, у якіх не было гэтага дакумента.

— Які ўклад вашага цэнтра ва «ўзаконьванне» сістэм — вы падахвочваеце прадпрыемствы, дапамагаеце распрацоўваць і ўкараняць, кантралюеце?..

— У прынцыпе правільна, важна было пераканаць, і ў першую чаргу дырэктара. А праз яго — калектыў. Інакш гэта будзе не сістэма, а вельмі шмат паперы дзеля... паперы. А калі мы дасягалі паразумення, тады пачыналася калектыўная вучоба. Уся сутнасць у тым, што гэта сістэма кіравання не столькі якасцю, колькі — вытворчасцю, пры якой высокая якасць прадукцыі гарантавана. І засваенне нейкіх новых, еўрапейскіх, скажам так, падыходаў да арганізацыі вытворчых працэсаў, да ўзаемадзеяння асобных падраздзяленняў, творчы ці нават крытычны падыход да тэхналогій немагчымы без навучання, без знаёмства з сусветным досведам. Тут нашу ролю складана прыменшыць.

На нашай тэрыторыі першыя сертыфікаты былі па ІСО 9000, затым пайшлі экалагічныя ІСО 14000. З'явіліся прадпрыемствы, якія сертыфікавалі свае сістэмы ІСО 22000. А практычна ўсе харчовыя прадпрыемствы, за рэдкім выключэннем, сертыфікавалі сістэмы па прынцыпе ХАССП. Зараз ідзе сертыфікацыя сістэм па ІСО 18000 — гэта сістэма кіравання аховай працы.

З навінак: у першай дзясятцы беларускіх прадпрыемстваў, якія атрымалі сертыфікат на права маркіраваць сваю прадукцыю знакам «Натуральны прадукт», быў і Баранавіцкі малочны камбінат.

— Ці можна сказаць, што вы і сёння працягваеце пашыраць сферу сертыфікацыі?

— Сферу акрэдытацыі па сертыфікацыі, калі правільна. У гэтым сэнсе мы выраслі значна. Некалі займаліся сертыфікацыяй толькі харчовай прадукцыі. Сёння створаны разнастайныя сектары, якія і займаюцца кожны сваёй тэматыкай. Мы пашырылі сферу сертыфікацыі, зыходзячы з інфраструктуры, з запатрабаванняў рэгіёна, які абслугоўваем.

Напрыклад, сфера бытавога абслугоўвання ахоплена сертыфікацыяй цалкам у той ступені, у якой яна падлягае сертыфікацыі. Калі паслугі цырульняў і хімчыстак належыць «экзаменаваць», то гэта паўсюдна зроблена. А паслугі гасцініц пакуль не ўвайшлі ў абавязковы пералік, хоць, на наш погляд, зрабіць гэта варта, тады ў гасцей горада не будзе прычын быць незадаволенымі.

— А ваша група экалагічнага нармівання — яна захавалася?

— І нават вырасла колькасна разы ў два, бо стала надзвычай запатрабаванай. Больш такіх спецыялістаў няма ні ў кога, таму група працуе па ўсёй Брэсцкай вобласці, а таксама на Міншчыне, у Прынёманскім краі. Падчас масавай атэстацыі працоўных месцаў члены групы праводзілі і замер шкодных фактараў вытворчага асяроддзя, што вельмі спатрэбілася ў ходзе атэстацыі.

Цяпер многія прамысловыя прадпрыемствы зацікаўленыя ў распрацоўцы экалагічных пашпартоў, і нашы спецыялісты могуць быць ім карыснымі.

— Ці растуць сумы штрафных санкцый парушальнікам стандартаў?

— Я не лічу, што гэта крытэрый ацэнкі эфектыўнасці дзяржаўнага нагляду. Наша пазіцыя — не караць, а дапамагаць і папярэджваць памылкі. Яна знайшла разуменне ў прадстаўнікоў дырэктарскага корпуса. Калі выйшаў указ аб прыпыненні кантрольна-наглядальнай дзейнасці да прыняцця новага дакумента, які і з'явіўся на мінулым тыдні, да нас звярталіся самі прадпрыемствы з просьбай прыслаць спецыялістаў калі не для праверак, то для кансультацый. Мы гэта ўспрынялі як давер.

Цяпер, у перыяд крызісу, калі не вельмі актуальнымі становяцца аб'ёмы выпушчанай прадукцыі, валавыя паказчыкі, сказаў у заключэнне Мікалай Мікалаевіч Лабко, акцэнты ў рабоце рэальнага сектара эканомікі маглі б змясціцца ў бок стандартызацыі. Увага вытворцаў магла б быць скіраванай на пытанні канкурэнтаздольнасці. Каб стварыць такую прадукцыю, якая пасля выхаду з крызісу змагла б здзівіць сваёй навізной і спажыўцоў, і спецыялістаў і з лёгкасцю заваявала б рынкі. Якасць — гэта ў многім апраўданне спадзяванняў спажыўца. Нават добра вядомыя вырабы могуць здзівіць сваёй новай формай, новым дызайнам, больш шырокімі функцыямі, смакавым дыяпазонам. Трэба смялей заяўляць аб сабе, рэкламавацца. «Мерсэдэсу» асаблівая рэклама не патрэбна, але яго рэкламуюць, машына бясконца ўдзельнічае ў аўтасалонах. А нашы вытворцы даволі часта такія магчымасці ігнаруюць: «Нас і так ведаюць у Маскве». А трэба, каб ведалі і на Палессі, у кожнай беларускай вёсачцы. Тады лозунг «Купляйце беларускае» атрымае новы імпульс.

УНП 200167576.

Каля стэнда камбіната харчовых прадуктаў — зацікаўленая размова пра якасць.

САНАТОРЫЙ «МАГІСТРАЛЬНЫ»: УСЁ ДЛЯ ВАШАГА ЗДАРОЎЯ

За вокнамі лістапад, а ў басейне лашчыць цела цёплая вада...

На ўскраіне Баранавічаў, сярод лесу, знаходзіцца адзін з лепшых санаторыяў не толькі на Беларускай чыгунцы, але і ў краіне. Тут ёсць усё для таго, каб чалавек мог адпачыць, папраўіць здароўе. Дыягностыка і лячэнне праводзяцца на ўнікальным абсталяванні. Высокакваліфікаваны медперсанал выкарыстоўвае ў сваёй рабоце вопыт старажытных лекараў і найноўшыя дасягненні сучаснай медыцыны.

У здраўніцы, якая з'яўляецца структурнай адзінкай Баранавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі, адна- і двухмесныя нумары з халадзільнікам, кабельным тэлебачаннем і тэлефонам. Сауна, трэнажорныя залы, крытыя тэнісныя карты, басейны — усё для адпачывальнікаў.

Дырэктар санаторыя Сяргей НАЎРОЦКІ.

Але ніхто найлепш не раскажа пра санаторый «Магістральны», як яго дырэктар Сяргей НАЎРОЦКІ.

— Думаю, што кожны, хто пабываў у нас, застаўся задаволеным. Наш санаторый адпавядае самым высокім еўрапейскім стандартам.

— Сяргей Вячаслававіч, пры высокіх стандартах, напэўна, і высокія цэны? І ўвогуле ці ёсць магчымасць у вашым санаторыі адпачыць рабочаму чалавеку?

— Не будзем забываць, што «Магістральны» належыць Беларускай чыгункі, і ў санаторыі адпачываюць найперш чыгуначнікі. Прыкладна 60 % пуцёвак прыпадае на іх долю. А што датычыцца цаны, то кошт 14-дзённай пуцёўкі для работніка чыгункі складае 799 тысяч рублёў. Але варта ўлічыць, што большую частку гэтай сумы аплачвае прадпрыемства. Для іншых грамадзян Беларусі цана такой пуцёўкі крыху вышэйшая — 853 тысячы.

— Значыць думка, што ваш санаторый «акупавалі» расіяне, не адпавядае сапраўднасці?

— Мы супрацоўнічаем з рознымі турыстычнымі фірмамі і заключаем з імі дагаворы. Для нас гэта выгадна. А што датычыцца грамадзян Расіі, то яны да нас едуць, бо ў «Магістральным» ім падабаецца. Найперш таму, што ў нашым санаторыі пакет паслуг больш шырокі, чым у аналагічных расійскіх санаторыях. Там чалавеку прадастаўляецца толькі пражыванне і харчаванне, а ў нас яшчэ і лячэнне.

— Колькі яны плацяць?

— Для ўсіх замежных грамадзян кошт 14-дзённай пуцёўкі складае 1474 тысячы рублёў. Гэта не шмат пры 5-разовым харчаванні і магчымасці прыняць 7-8 лячэбных працэдур. Дарэчы, да нас прыязджалі немцы, і цана пуцёўкі іх здзівіла — здалася дужа нізкай. У «Магістральным» адпачываюць грамадзяне з Прыбалтыкі, Ізраіля і іншых краін. У асноўным гэта прадстаўнікі рускамоўнага насельніцтва, якія ў свой час пакінулі Беларусь.

— Наўкол крызіс, а ваш санаторый квітнее. Відавочна, будучыня «Магістральнага» бачыцца светлай?

— Кажучы шчыра, то крызісу мы не адчуваем. І сёлета адпачывальнікаў будзе не менш, чым летась. Тут ёсць і пэўная заслуга калектыву. Сёння санаторыям даводзіцца самім шукаць кліентаў. Мы сталі развіваць уласную маркетынгавую службу, стварылі інтэрнэт-сайт... Калі стаяць на месцы, то канкурэнты хутка абгоняць. Вось чаму закупляем новае абсталяванне, паляпшаем якасць абслугоўвання, адным словам, рухаемся наперад. Дзякуючы пастаяннай падтрымцы і дапамозе з боку кіраўніцтва Баранавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі.

— Сяргей Вячаслававіч, да «Магістральнага» далучылі «Свіцязь», зараз гэта аддзяленне вашага санаторыя. Напэўна, там таксама адбыліся перамены?

— Раней гэта быў даволі «шэры» пансіянат, а сёння тут сучасныя будынкі, якія і павінны быць на беразе авеянага легендамі возера. Але найлепш у санаторыі «Свіцязь» пабываць, чым пра яго весці аповед. І ўсё ж адзначу, што там мы ўстанавілі крыасаўну — гэта сучаснае і дарагое абсталяванне. У нашай краіне яно ёсць усяго ў некалькіх медыцынскіх установах. Крыятэрапія шырока прымяняецца ў медыцыне. Яе можна прызначыць пры павышанай тэмпературы, для зняцця стрэсу, эфектыўна дзейнічае крыасаўна і супраць цэлюліту. А таму вельмі папулярная ў жанчын, якія хочуць пахудзець. У «Свіцязі» могуць паправіць здароўе тыя, у каго ёсць праблемы з органамі дыхання і сістэмай кровазвароту. Там можна выдатна адпачыць у любую пару года — сама прырода краю спрыяе гэтаму.

У свой час Беларуская чыгунка ўклала (ды і ўкладвае) у санаторый «Магістральны» вялікія грошы, і яны не былі патрачаны ў пустую, бо самае дарагое, што ёсць у нас — гэта здароўе.

Слова — намесніку дырэктара па медыцынскай частцы санаторыя Ігару ЛУКОШКУ.

— У «Магістральным» правадзіцца лячэнне і прафілактыка захворванняў сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэмаў, органаў стрававання, дыхання, нырак і касцёва-мышачнай сістэмы. У нас працуе дзевяць урачоў першай і вышэйшай кваліфікацыі і 33 медыцынскія сястры. Вопытныя спецыялісты, сучаснае медыцынскае абсталяванне, сама атмасфера санаторыя даюць магчымасць адпачывальнікам аднавіць свае сілы.

— Ігар Яўгенавіч, ці можна сказаць, што хворага чалавека, які прыехаў у «Магістральны», праз два тыдні паставіце на ногі?

— Давайце на рэчы глядзець рэальна. Да нас часта прыходзяць з цэлым букетам хранічных захворванняў і вылечыць іх за 14 дзён немагчыма, ды санаторый не бальніца. Але ў нас чалавек можа адарвацца ад быту, работы, у яго ёсць магчымасць адпачыць. Натуральна, што і падлячыць можна. Вось, напрыклад, аднаго мужчыну даймаў бранхіт, і на працягу года ён тройчы быў на бальнічным, а прайшоў у нас працэдуры і цэлы год не хварэў.

— Якія працэдуры можна прайсці ў «Магістральным»?

— Бальнеалагічныя ванны, падводны душ-масаж, мануальную тэрапію, гідратэрапію кішэчніка, інгаляцыі, рэфлексатэрапію, лазератэрапію, цяпло- і святлолячэнне, лячэнне глеевымі і сапрапелевымі грязямі. І яшчэ шмат якія працэдуры ёсць у нас. Як і розныя віды дыягностыкі.

— А ці ёсць магчымасць прымаць усе гэтыя працэдуры, але без пражывання і харчавання?

— Калі ласка, чалавек прыходзіць да нас з выпіскай з медыцынскай карты, плаціць 300 тысяч рублёў у бухгалтэрыю і 14 дзён лечыцца.

Дададзім, што ў санаторыі для адпачывальнікаў — 196 месцаў, і летам запоўненасць высокая, а ў другую пару года пуцёўку набыць можна.

«А зараз пачынаем апорны масаж...»

Адрас санаторыя «МАГІСТРАЛЬНЫ»
225410, Брэсцкая вобл., г. Баранавічы, вул. Гаевая, 7
т/ф (8 0163) 47 15 60
тэл. 47 07 90 (кругласут.)
рэалізацыя пуцёвак 47 16 68
www. rw. by
(сацыяльная сфера)
e-mail: g bsan@brnv.rw.by

Адрас санаторыя «СВІЦЯЗЬ»
231403, Гродзенская вобл., Навагрудскі раён, п/а Валеўка
тэл. (8 01597) 76 5 05 (нам. дырэктара)
76 5 35 (бухгалтэрыя)
76 5 06 (рэгістратура)

Падводная выцяжка пазваночніка метадам правісання.

ПАРА СТАЛАСЦІ

Слова — старшыні Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў Уладзіміру Іванавічу СТАХНОВУ

Аднадумцы. Старшыня гарсавета Уладзімір СТАХНОЎ (у цэнтры) з членамі прэзідыума Віталем КУРЭЦКІМ — начальнікам службы перавозак ААТ «АП г. Баранавічы» і Аляксандрам АКУЛАВЫМ — дэканам інжынернага факультэта Баранавіцкага ўніверсітэта.

У снежні наступнага года Баранавіцкаму гарадскому Савету спаўняецца 70 гадоў, таму цяпер уся наша работа арыентавана на гэтую важную падзею. На сесіі зацвердзілі спецыяльныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да знамянальнай даты. Пачалі сустракацца з дэпутатамі мінулых скліканняў, якія працавалі ў Савеце ў няпростыя 70-я і 80-я, «ліхія» 90-я гады. Прайшло ўжо некалькі такіх сустрэч, у ходзе якіх даведаліся нямала цікавага з гісторыі свайго горада і яго органаў мясцовага самакіравання.

Дэпутаты гарсавета шмат карыснага зрабілі і робяць для росквіту Баранавічаў, і з цягам часу ўсе сабраныя факты, магчыма, абагульнім і выдадзім асобнай кнігай. І ўпрыгожым яе каляровымі фотаздымкамі сучаснага еўрапейскага горада, які стаў такім дзякуючы народнай уладзе. А пакуль, каб факты не «пыліліся на паліцы», найбольш цікавыя ўспаміны друкуем у аб'яднанай газеце «Наш край».

На ўрачыстасцях, якія пройдуць з нагоды такой падзеі, прааналізуем, безумоўна, што зроблена, але галоўным чынам размова пойдзе пра новыя гарызонты, новыя падыходы да выклікаў часу.

Сфера інтарэсаў гарадскога Савета — шырокая, разнастайная, як само жыццё. Вось прыклады дэпутацкай актыўнасці: толькі за апошні час па зваротах жыхароў горада і з прамым удзелам дэпутатаў адкрыты маршруты гарадскіх аўтобусаў № 2 і № 20, які затым быў падоўжаны да вёскі Гірава, праведзены добраўпарадкаванне мікрараёна па вулцы Паркавай і асфальтаванне вуліцы Розы Люксембург, створаны камітэт КТОС «Надзея», абсталяваны прыпынак для грамадскага аўтатранспарту па вуліцы Тэльмана, вырашаліся пытанні працаўладкавання, добраўпарадкавання тэрыторый і іншыя. Шэраг важкіх рашэнняў прыняў сам Савет.

І ўсё ж сёння найбольшы клопат выклікае эканоміка, і ўплываць на яе гарадскі Савет рэальна можа праз свае пастаянныя камісіі і праз сваіх дэпутатаў, сярод якіх шмат кіраўнікоў працоўных калектываў.

Ідзём па спіску: Марат Юр'евіч Азараў — дырэктар прыватнай мэблевай фірмы. Генадзь Іванавіч Валынец узначальвае фірму «Лагуна», ён член прэзідыума гарадскога Савета. Дзмітрый Антонавіч Гаўрыленя — дырэктар прадпрыемства электрасетак. Вячаслаў Паўлавіч Дуньковіч — галоўны інжынер будаўнічага трэста. Віталь Багданавіч Курэцкі — старшыня камісіі па эканамічным развіцці, пытаннях бюджэту і кіраванні камунальнай уласнасцю. Яўген Віктаравіч Руды — дырэктар прадпрыемства «Бархім», якое з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам тавараў бытавой хіміі ў Беларусі. Наталля Віктараўна Манько — сенатар, дырэктар акцыянернага таварыства «Баранавічхлебапрадукт», на рахунку якога вельмі многа яркіх працоўных здзяйсненняў і пра чые здабыткі тры разы за апошнія гады даволі падрабязна расказвала на сваіх старонках «Звязда».

Ёсць вартыя ўвагі навіны і сёння. Для больш поўнага задавалення спажывецкага попыту на прадукцыю камбіната хлебапрадуктаў на працягу жніўня-верасня гэтага года тут была праведзена акцыя па зніжэнні цаны на пшанічную муку вышэйшага гатунку для рознічнай гандлёвай сеткі, а таксама адкрыты новыя гандлёвыя пункты на рынках горада. На прадпрыемстве пашыраецца асартымент тавараў і нязменна высокім застаецца якасць мясной прадукцыі (ёсць у іх і такая).

Іх калегі з Баранавіцкага хлебазавода павялічылі асартымент піражкоў і кандытарскіх вырабаў, аднавілі рэалізацыю торта «Напалеон». На прылаўках з'явіліся новыя тарты — «Графскія руіны», «Мурашнік», «Барыня» і іншыя.

Баранавіцкі малочны камбінат асвоіў выпуск цвёрдых сыроў, а гэта «задачка» не для слабых. Такія прыклады ёсць і на іншых прадпрыемствах: на большасці з іх з мэтай пашырэння асартыменту асвоены выпуск новай прадукцыі. Скажам, камбінат харчовых прадуктаў наладзіў вытворчасць канфіцюраў, павідла і таматных соусаў, пачаў выпуск кетчупаў і соусаў у поліэтыленавай і шкляной тары. Усё гэта сведчыць аб граматнай маркетынгавай палітыцы кіраўніцтва і аптымізме самога калектыву.

Свой важкі ўклад у эканоміку, у развіццё сацыяльнай сферы горада робяць усе 35 народных выбраннікаў. (Было 36, але летась Святлана Сяргееўна Пішч выбрана дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Мы былі, вядома ж, не супраць такой «ратацыі».) 27 з іх — кіраўнікі розных узроўняў, людзі вопытныя і паважаныя ў горадзе. Як, дарэчы, і астатнія.

Любы буйны індустрыяльны цэнтр зацікаўлены ў развіцці міжнародных кантактаў, і гарадскі Савет выкарыстоўвае ўласныя магчымасці для далейшай інтэграцыі, перш за ўсё ў еўрапейскую супольнасць. У нас падпісаны каля 20 дагавораў з мэрыямі і грамадскімі арганізацыямі замежных гарадоў аб супрацоўніцтве, і праз іх выкананне мы садзейнічаем пашырэнню дзелавых кантактаў.

Цяпер найбольш актывізаваліся адносіны з Літвой, Латвіяй і Польшчай — членамі Еўрасаюза. Народная ісціна гаворыць, што заўсёды найбольш карыснымі, найбольш эфектыўнымі былі добрасуседскія сувязі, стасункі суседзяў. Еўрасаюз выдзяляе сродкі пад розныя праграмы, і суседзі прыцягваюць для ўдзелу ў іх і наш горад.

Прывяду такі, магчыма, крыху нечаканы прыклад. У рамках цікавага і перспектыўнага праекта «Мастацтва не ведае межаў» выхаванцы нашай мастацкай школы жылі ў Бяла Падляску, удзельнічалі ў пленэры, пісалі свае карціны, арганізавалі з польскімі равеснікамі выставу. Потым да нас прыязджала польская моладзь. Не ўсе гэтыя беларускія і польскія хлопчыкі і дзяўчаткі стануць мастакамі, нехта абавязкова будзе працаваць у рэальным сектары эканомікі і адправіцца па знаёмых адрасах, да даўніх сяброў вырашаць пытанні суменшага бізнэсу. Таму што бізнэс таксама не ведае межаў.

Ужо сёння трывалыя кантакты ўсталяваліся паміж нашымі і літоўскімі, латвійскімі камунальнікамі, якія працуюць па новых еўрапейскіх стандартах, і іх вопыт надзвычай карысны. Хоць і яны таксама зусім слушна лічаць, што ў нас ёсць чаму павучыцца, асабліва ў роднаснага калектыву «Водаканала», аднаго з вядучых прадпрыемстваў галіны Беларусі, і многае ў яго перанялі.

Існуе, да слова сказаць, і жывы абмен вопытам паміж органамі мясцовага самакіравання. Мы ездзілі ў Шаўляй, яны прыязджалі да нас.

Найбольш актуальныя пытанні эканамічнага жыцця горада ў цэнтры нашай увагі. На адной з сесій гарсавета разгледзелі сітуацыю па рацыянальным выкарыстанні паліўна-энергетычных рэсурсаў, прыроднага газу, вады і ўкараненні энергаашчаджальных тэхналогій, заслухалі справаздачы шэрагу кіраўнікоў калектываў. Пытанне аб рабоце перапрацоўчых прадпрыемстваў горада па забеспячэнні жыхароў высакаякаснай прадукцыяй разгледжана на пазачарговай нядаўняй сесіі ў чэрвені. Заўвагі і прапановы выказаныя дэпутатамі на сесіях, улічаны кіраўнікамі прадпрыемстваў.

Разам з выканкамам мы лічым сваім абавязкам падтрымліваць рэальны сектар эканомікі, дапамагаць яму, і робім крокі да таго, каб заахвоціць жыхароў горада купляць прадукцыю сваіх, баранавіцкіх прадпрыемстваў. Не за кошт адміністрацыйнага выцяснення канкурыруючых вытворцаў, а дзякуючы несумненна высокай якасці мясцовай прадукцыі, мясцовых тавараў, і за кошт даступнай цаны. Дэпутатамі праводзілася апытванне насельніцтва, анкетаванне з мэтай вывучэння пакупніцкага попыту на прадукцыю баранавіцкіх вытворцаў. Пасля зацікаўленай размовы на адной з сесій Савета быў усталяваны рэйтынг «10 лепшых тавараў горада», які вызначаюцца ўпраўленнем гандлю на падставе статыстычных звестак з перыядычнай публікацыяй вынікаў у газеце «Наш край».

Так што працуем у гэтым актуальным кірунку і з гандлем, і з самімі вытворцамі. Рэкамендуем ім: «Старайцеся, каб бралі ваша, каб вашае было самым лепшым». Такую вось лінію праводзім, хоць і без нейкага націску. Ва ўмовах эканамічнай нестабільнасці лічым яе апраўданай.

Усе прадпрыемствы горада працуюць над шырокай рэкламай сваёй прадукцыі, праводзяць выставы-прэзентацыі, выставы-дэгустацыі, распрацоўваюць прыгожыя этыкеткі для новага асартыменту, інфармацыя аб навінках размяшчаецца ў СМІ і на ўласных сайтах у інтэрнэце. У гэтым сэнсе карыснай была і выстава «Баранавіцкая восень 2009». Эканоміка горада яшчэ раз прадэманстравала сваю жыццяздольнасць і «стрэсаўстойлівасць».

Гарадскія мадэльеры прапанавалі на выставе свае навінкі да вяселля, а інжынер-тэхнолаг авіярамонтнага завода Уладзімір ВОЛКАЎ пазнаёміў навед-вальнікаў з вырабамі прадпрыемства для выкарыстання ў будаўніцтве.

Ажыўлена было і каля стэнда фабрыкі мастацкіх вырабаў, гараджане цікавіліся новымі мадэлямі дзіцячага адзення.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ і Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«Святыя дзяды, хадзіце да нас!»

«Святыя дзяды, завём вас, хадзіце да нас, ляціце да нас,
чым толькі хата багата, што ёсць тут — я для вас ахвяраваў.
Прыходзьце, дзяды, радзіцеля і старыя,
і немаўляты, і малыя.
І тыя, каму не к каму ісці, і тыя,
хто ў гэтых мясцінах жываў, хлеба-солі ядаў.
Да свайго стала, да свайго прыпечка хлеба-солі засылайце,
каб было чым душу поўніць: год ад году, век ад веку».

На працягу года кожнае беларускае свята несла ў сабе патэнцыял, энергію абуджэння, шчырае спадзяванне на тое, што заўтрашні дзень будзе шчаслівейшым. Глядзіце самі: Каляды цешылі надзеяй набліжэння да святла, Масленіца сагравала душу спадзяваннем на раннюю вясну, Тройца-Сёмуха абуджала юначае каханне і набліжала шлюб, Купалле ўсцешвала магіяй чаравання.

Прыходзіла восень. І толькі адно свята паварочвала нашы думкі да сівой мінуўшчыны. Аднак гэта не было сведчаннем нейкай выключнасці або непаразумення. Восеньскія Дзяды запрашалі прысесці, адпачыць і паразважаць: а ўласна кажучы, дзякуючы каму і чаму магчымым было ўсё тое, што поўніла жыццёвую плынь на працягу года. Калі ўсе астатнія святы — гэта ўзлёт пачуццяў, абвостранасць адносінаў і збліжэнне мужчынскага і жаночага энергетычнага патэнцыялу дзеля захавання і працягу роду, то Восеньскія Дзяды — гэта філасофскі розум, які ўздымаў чалавека над праблемамі будзённасці і пераносіў у прасторы Вечнасці. А Вечнасць не зводзілася да асэнсавання толькі таго, што цябе чакае наперадзе, асабліва пасля смерці. Наадварот, хутчэй, гэта суаднясенне цябе сённяшняга з тваім радаводным дрэвам: **хто ты, як ты ўсхваляваў свой Род, каго ведаеш або памятаеш, якім чынам ганаруеш традыцыю сваіх продкаў?**

Фактычна кожнае свята народнага традыцыйнага календара ўтрымлівала ў сваёй духоўна-мастацкай аўры элемент абавязковай пашаны продкаў: першая лыжка куцці на Каляды, першы блін на Масленку, першае печыва на Саракі і г. д. Разам з тым два асноўныя гадавыя святы актывізацыі нашай памяці, ажыўлення дыялогу са «светам» памерлых — веснавая Радаўніца і Змітраўскія Дзяды — акаймоўвалі ўвесь вытворча-земляробчы цыкл сялянскіх работ. Радаўніца заклікала нас наведваць магілы продкаў і навесці парадак там, каб заручыцца іх падтрымкай ва ўзгадаванні багатага ўраджаю. А на Восеньскія Дзяды мы, сабраўшы новы ўраджай, павінны былі запрасіць прашчураў дадому і падзякаваць — падзяліцца здабыткамі сваёй карпатлівай працы.

Пасля свята «Багач» сям'я станавілася багатай, а таму на Восеньскія Дзяды накрывалі багаты стол. У некаторых этнаграфічных крыніцах звяртаецца ўвага на тое, што святочныя стравы памінальнага стала падаваліся ў пэўнай паслядоўнасці. Напрыклад, частаванне «дзядоў» і жывых у Слонімскім павеце мела наступны парадак:

«...у большасці сялян абавязковымі стравамі лічацца: у пятніцу — квас, сялёдка, гарох і грачаная каша, а ў суботу — у многіх пяруць «пірагі» (той жа хлеб, толькі прэсны, і булкі качаюць у муку), куцця — гарох з макам ці сухі, бліны грачаныя, квас ці капуста, мясныя стравы — большай часткай свініна, аднак у многіх на розныя выпадкі прынята мець ялавічыну, бараніну і кураціну, пасля мяснога падаюць макароны, грачаную кашу і яечню...

У доме жыве перакананне, што калі толькі не прыгатаваць да Дзядоў тое, што ўжо раз кімсьці ў доме заведзена, то па гэтай частцы ў гаспадарцы таго дома будзе нястача. Так, калі няма ялавічыны, бараніны, кураціны і г.д., то ў тым доме прападзе што-небудзь з рагатай жывёлы, авечак, курэй».

Была яшчэ адна спецыфічная рыса ў фарміраванні і сервіроўцы святочнага стала. Лічылася, што «свет» памерлых суправаджае сімволіка няпарнасці («не ў пары»), таму на стол трэба было паставіць няцотную колькасць страў: 7-9-11. Але ж за сталом садзіліся жывыя, якім накавана жыць у пары, таму побач з імі павінна была быць сімволіка цотнасці. Якім жа чынам трэба было накрыць стол так, каб не пакрыўдзіць памерлых? Аказваецца, кожная страва падавалася на стол на дзвюх талерках: страў будзе сем, а талерак чатырнаццаць!

Толькі адзін раз на год сям'я ставіла стол не так, як заўсёды — уздоўж сцяны ад двара, гэта значыць ад чырвонага кута, і да парога, — а ўпоперак хаты, пад другой бэлькай, якая якраз і была тым сямейным летапісам, у які «ўпісвалі» (выразалі ці наносілі фарбай, крэйдай, дымам свечкі) імёны памерлых дамачадцаў. І паколькі за вясельным ці памінальным сталом людзі садзіліся, пачынаючы з чырвонага кута, так і на бэльцы радавод пачыналі ад абразоў.

Увечары, як толькі сцямнее, усе збіраліся вакол святочнага стала. Старэйшы сярод прысутных паварочваўся да покуці, чытаў малітву, затым станавіўся тварам да парога і прамаўляў ці не самае незвычайнае запрашэнне, звяртаючыся, бадай што, да самых незвычайных гасцей: *«Святыя дзяды, хадзіце да нас!»*.

Пасля частаванняў, няспешнай размовы пра родных, сваякоў, сяброў і суседзяў, сям'я ўставала. Гаспадыня накрывала стол бялюткім абрусам (прыбіраць памінальны стол дазвалялася толькі раніцай наступнага дня), а гаспадар зноў звяртаўся да душ продкаў:

«Святыя дзяды,
Вы сюды прыляцелі, пілі елі,
Ляціце ж цяпер да сябе!
Скажыце, чаго яшчэ трэба?
А лепей ляціце на неба!
Акыш, Акыш...»

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

УЗГАДВАЮЧЫ БЕРЛІНСКУЮ СЦЯНУ

Айчынныя тэлеканалы выкарыстаюць гэту нагоду — 20-я гадавіна падзення Берлінскай сцяны, што адзначаецца сёлета — для правядзення Дзён Германіі. На працягу тыдня, пачынаючы з 8 лістапада, гледачам пакажуць мастацкія і дакументальныя фільмы, а таксама канцэртную праграму, падрыхтаваныя нямецкай тэлекампаніяй Mitteldeutscher Rundfunk.

З мастацкіх фільмаў немцы вырашылі падзяліцца з беларусамі рамантычнымі меладрамамі — 9 і 10 лістапада на Першым канале будуць ісці рамантычная меладрама М. Борка «Масты кахання» і Г. Кубаха «Нявеста майго сябра», а таксама прызёр міжнародных кінафестываляў, меладрама С. Тадзікена «Шчасце Эмы». Дакументальныя фільмы з цыкла «Германія ў карцінках» пазнаёмяць беларусаў з маляўнічым горадам Вернігеродзе і правядуць па цячэнні ракі Верра.

Дарэчы, як расказалі ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, мастацкія фільмы да нас трапяць у расійскім дубляжы, а дакументальныя тэлекампанія агучвала ўласнымі сіламі. БТРК і Mitteldeutscher Rundfunk, якія супрацоўнічаюць з 2002 года, ужо не раз абменьваліся фільмамі і праграмамі, і плануюць рабіць гэта надалей.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАНЯДЗЕЛАК, 9 ЛІСТАПАДА

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.55 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.30 У свеце матораў.
9.10 Nota Bene.
9.40 «Зорныя танцы».
11.00, 17.25 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
12.10 Меладрама «Масты кахання».
14.05 Ток-шоу «Жыццё як жыццё».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Культурныя людзі.
15.55 Здароўе.
16.25 Серыял «Сёстры па крыві».
18.25 «Даруй мне».
19.30 «Арэна».
19.55 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 «Злачынства і пакаранне».
22.05 Серыял «Часткі цела».
23.10 Меладрама «Шчасце Эмы».
1.05 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 1.20 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 1.35 Навіны спорту.
11.10 «Рэкламная паўза».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.40 «Модны прыгавор».
14.45 «Кантрольная закупка».
15.15 Серыял «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант».
16.15 Ералаш.
16.45 «Бітва тытанаў».
18.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.00 Серыял «Марскі патруль-2».
0.15 Навіны спорту.
23.20 «Злачынствы стагоддзя».
23.55 Серыял «Жанатыя... з дзецьмі».
0.30 Серыял «У захапленні ад цябе».

7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 22.55 Серыял «Юрыкі».
